ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

Дзедзіч — Зберагчы і памяткаўцы

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 4 (29)

ЧЭРВЕНЬ 2004

2 ЗАКОНЧЫЎ ВНУ – ПРАЦУЙ БЯСПЛАТНА! Чакаем размеркавання на 5 гадоў

3 ПРА НАС, ЛЮБІМЫХ... Талерантных і памяркоўных

4 ЯК ЗМАГАЦЦА СУПРАЦЬ КАНТРАКТАЎ? «Вертыкаль» выконвае чарговы загад

6 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР Чэрвень: Людзі і падзеі




Фота: ByMedia.net

**У вялікі мітынг прадпрымальнікаў перарасла афіцыйная маёўка на плошчы ім. Леніна ў Гародні. Акцыя праходзіла ў тым ліку і пад палітычнымі лозунгамі "Лукашэнка – у адстаўку!", "Не – трэцяму тэрміну!" і інш. У акцыі прынялі ўдзел каля 2000 чалавек.**

# БУНТУЕМ!

ГАРАДЗЕНСКІЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ, ДАВЕДЗЕНЫЯ ДА АДЧАЮ БЯСКОНЦЫМІ НАЕЗДАМІ З БОКУ КАНТРАЛЮЮЧЫХ ОРГАНАЎ, ВЫРАШЫЛІ ПРАВЕСЦІ АКЦЫЮ ПРАТЭСТУ.

Прычым яны зрабілі хітрэй за самых дасведчаных апазіцыянераў – яны не падавалі заяўку на правядзенне мітынгу ці пікету, як патрабуе беларускі закон, яны не праводзілі несанкцыянаваных шэсцяў. Яны проста прыйшлі на першамайскую дэманстрацыю, якую ладзілі гарадскія ўлады. Але са сваімі лозунгамі, самым лаяльным з якіх быў заклік «Лукашэнка – у адстаўку!».

Гарадзенскія спецслужбы, атрымаўшы інфармацыю пра плануемую акцыю прадпрымальнікаў, загадалі адмяніць прымусовы ўдзел у першамайскіх святочных мерапрыемствах студэнтаў гарадзенскіх ВУЗаў і іншых навучальных устаноў.

Што тычыцца берасцейскіх прадстаўнікоў малога бізнэсу, то яны, відаць, цалкам задаволены сітуацыяй у краіне, бо ніякіх праяў бунтарства ў іх асяроддзі не назіраецца. І дарэмна. Бо знішчаюць, як вядома, па адным.

**Б. Дэпеша**




## ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!

**– Калі Вы падзяляеце нашыя погляды на сучасную сітуацыю ў Беларусі і нашыя надзеі на будучыню,**

**– калі Вы жадаеце супрацоўнічаць з намі, стаць сябрамі "Сузор'я" ці проста перадаць цікавую інфармацыю,**

**паведамляем, што звязацца з намі можна праз распаўсюджвальнікаў нашай газеты, альбо па тэл.:**
**23-68-02 з 12⁰⁰ да 21⁰⁰.**
**Маб.: (029) 660-57-41, (029) 725-15-39.**

## МЫ ЧАКАЕМ ВАС!

**Прэс-служба БАМГА "Сузор'е"**

## ДЗЕДЗІЧ ЗАПРАШАЕ НА ЛЕТНІК!

На Шпітальным востраве Берасцейскай крэпасці знаходзяцца рэшткі самага старога будынку нашага горада – кляштара бернардзінак.

Гэта адзіная пабудова, што захавалася з часоў старога Берасця, які быў зруйнаваны расейцамі ў 1830-я гг. для будаўніцтва крэпасці.

Штогод моладзевыя арганізацыі праводзяць акцыі па ачыстцы кляштара ад смецця і раслін, што разбураюць сцены.

**У канцы чэрвеня – пачатку ліпеня** БАМГА «Сузор'е» і Фонд «Дзедзіч» ладзяць чарговы **10-дзённы летнік на Шпітальным востраве.**

Да ўдзелу ў справе захавання нашай спадчыны запрашаюцца ўсе, хто мае:
– вольны час; узрост ад 16 да 25 гадоў.

**У праграме летніка:**
– ачыстка кляштара, пракладанне пешаходнай сцяжынкі, высейванне траў і кветак;
– сустрэчы з вядомымі берасцейскімі музыкамі, літаратарамі, грамадскімі дзеячамі;
– дыскусіі і дэбаты па актуальных тэмах;
– гульні і семінары.

**Арганізатары забяспечваюць смачнае харчаванне, месцы ў палатках і добры настрой.**

**Калі вас зацікавіла наша прапанова, дадатковую інфармацыю вы можаце атрымаць па тэл.: (0162) 23-68-02; (029) 660-57-41 (Дзмітрый), (029) 725-15-39 (Андрусь).**

## АДНЫМ РАДКОМ

### УПЕРШЫНЮ ВЫЙШАЎ СПЭЛЧЭКЕР БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ MICROSOFT WORD

Праграма “Літара 1.0” стала самым вялікім слоўнікам беларускай мовы, бо ўтрымлівае больш за 170 тысяч словаў. Да прыкладу, украінскі аналаг налічвае каля 137 тысяч словаў. Галоўным навуковым кансультантам “Літары 1.0” стаў прафесар мовазнаўства Генадзь Цыхун.

Унікальнасць праграмы ў тым, што яна ахоплівае дзве правапісныя традыцыі: афіцыйную — “наркамаўку” і класічную — “тарашкевіцу”. Над варыянтам тарашкевіцы працавалі Зміцер Саўка, Юрась Бушлякоў, Зміцер Санько, Сяргей Шупа і Вінцук Вячорка.

Распавядае каардынатар праекту, прадстаўнік Таварыства Беларускай Мовы Сяргей Кручкоў:

– Усе, хто ўваходзіў у рабочую групу, прыйшлі да згоды, што ў нас няма дзвюх моваў, а ёсць дзве правапісныя традыцыі. І калі, напрыклад, сёння слова сустракаецца пераважна ў тарашкевіцкіх тэкстах, то яно мусіць сустракацца і быць раўназначным і ў наркамаўскіх тэкстах. Няма такога, што слова “выбарнік” — толькі тарашкевіцкае. І мы таксама верым у тое, што наш прадукт будзе выкарыстоўвацца і ў дзяржаўных установах.

Праца над праектам яшчэ працягваецца. Напрыклад, незавершаная граматычная частка “Літары 1.0”. Праграма правярае толькі правільнасць напісання словаў, але паасобку, без прывязкі да склонаў. Альбо — у тарашкевіцы ёсць спрэчныя пытанні з напісаннем замежных уласных імёнаў. Тлумачыць Зміцер Саўка:

– Напрыклад, якім чынам будзе перадавацца прозвішча папулярнага ангельскага пісьменніка Swift — праз “ў”, “у”, ці “в”?

Дарэчы, ва Украіне падобная праграма існуе даўно. У стварэнне праграмы ўкраінская дзяржава ўклала вялікія грошы. А ў Беларусі праграма створаная на голым энтузіязме.

Самую складаную, манатонную працу ўзяў на сябе Фёдар Піскуноў — тэхнолаг праекта. Той самы чалавек, які перапрацаваў сотні тысяч словаў і адпаведным чынам спарадкаваў іх у сістэму:

– Не было ніякіх надзейных крыніцаў у электронным выглядзе. Вельмі вялікі пласт лексікі не ўлічаны ў лексікаграфічных працах. Лексіка з газетаў, радыё, тэлебачання. Усё тое новае, што з'явілася з цягам часу. Напрыклад, “іпатэка”, “харызма”.

Праект “Літара 1.0” ёсць грамадскай ініцыятывай. Таму праграма будзе не прадавацца, а распаўсюджвацца бясплатна. Напрыклад, версія, што месціцца ў Інтэрнэце па адрасе **www.pravapis.tut.by** мае абнаўляцца не радзей як раз на тры месяцы.

**Dzedzich week-news**

**Шаноўныя сябры!**
**Рэдакцыя “Дзедзіча” з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб’явы ў наступны нумар бюлетэня, якія пабачыць свет у сярэдзіне верасня 2004 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 23-68-02 да 20.08.04.**

## ЦЫТАТА МЕСЯЦА

# ОТРАБОТКА ДЛИНОЙ В 5 ЛЕТ

А. ЛУКАШЕНКО: «ЗАКОНЧИЛ ВУЗ – БУДЬ ГОТОВ ПЯТЬ ЛЕТ, А МОЖЕТ И БОЛЬШЕ, РАБОТАТЬ ПО РАСПРЕДЕЛЕНИЮ».

Президент считает, что государственный контроль за распределением молодых специалистов должен быть ужесточен. Как сообщает пресс-служба главы государства, такое мнение президент высказал 12 мая на совещании по вопросам создания в Барановичах учебного заведения университетского типа. "Мы тратим бюджетные деньги на обучение молодых людей, а они уходят в коммерцию, уезжают за границу, – сказал А.Лукашенко. – …Закончил вуз, государство тебя содержало – будь готов пять лет, а может и больше, работать по распределению. Не явился по целевому направлению – будут применяться санкции, вплоть до лишения диплома".



Фота: ByMedia.net

Действенной мерой по борьбе с "уклонистами", по мнению президента, должно стать возмещение ими средств, затраченных государством на их образование. "При этом деньги должны быть реальными: будут возмещать столько, сколько сегодня стоит обучение. Мы же никого не заставляем идти в тот или иной вуз. Заранее говорим: если бюджет за тебя платит, имей в виду, что государство тобой распоряжается", – подчеркнул Лукашенко.

**Белорусские новости (naviny.by)**

### А что думают те, кого эти высказывания касаются непосредственно?

*Да, обидно. Почему я должна пахать 5 (!) а то и больше лет по чьей-то указке. Ладно бы только это. Так работать-то приходится не просто за гроши, а за бесплатно! Мне 23 года. Вроде как надо уже подумать о семье, о детях. А если и мой муж только что закончил ВУЗ и нас вместе распределили работать куда-нибудь в Брагин или Хойники, то как, скажите, молодой семье существовать, как поднимать, блин, рождаемость этой страны, если тебя заперли в Чернобыльскую зону, дали тебе в зубы гроши, на которые невозможно физически нормально жить и всё это на 5 лет… К 30 годам может и удастся куда-нибудь убраться подальше, потом еще пару лет на обустройство на новом месте. Опять же, трудности с новой работой. И детей, что ли, в итоге в 40 рожать?!*

*Я всё просекла – Л. затеял геноцид белорусской нации…*

***Выпускница***

*Пока будем сидеть по шхерам, Главный Больной сделает всех своими рабами. Я не удивлюсь, если одним из указов будет предписано всем ходить в шароварах в сочетании цвета детской неожиданности и крови. Так что пока молчим… Готовьте цаки в нос. Пока еще не предписали говорить "Ку". Но это еще впереди.*

***Андрей***

*АГЛ провозгласил построение в нашей стране рыночного социализма. Социализм предусматривает множество бесплатных благ для*

# ПРА НАС, ЛЮБІМЫХ

ХАРОШЫ, РАХМАНЫ І ПАКОРЛІВЫ, ХОЦЬ ДА РАНЫ ПРЫКЛАДАЙ... БЕЗКАНФЛІКТНЫ І БАЯЗЛІВЫ, АДМОЎЧЫЦЦА – НАВАТ ТАДЫ, КАЛІ ЯГО ПРАЎДА.

Прыкладна такі абагульняючы вобраз беларуса склаўся на працягу пэўнага часу ў народаў блізкага замежжа. А яшчэ мы працавітыя, хаця па памеры заробкаў гэтага адразу і не заўважыш. А яшчэ мы талерантныя ды памяркоўныя. Знаёмыя словы? Напэўна, знаёмыя. Дастаткова адчыніць любы (літаральна ЛЮБЫ) падручнік на гісторыі Беларусі, каб адразу ж, пры стварэнні збіральна-абагульняючага вобраза беларусаў, натыкнуцца на гэтыя прыметнікі. І тут не мае розніцы: ці гэта падручнік па гісторыі савецка-таталітарных часоў, ці падручнік проста часоў аўтарытарызму.

Як выказаўся адзін "непапулярны" Паэт Беларусі: "Чытайце казкі, хлопцы і дзяўчаты..." Чаму казкі? Ды таму, што толькі ў казках нярэдка вобразы і характары маюць інверсійнае значэнне. Скажам, быў Іван-дурань, а адхапаў сабе караля-цесця ды яшчэ і энную колькасць каралеўскіх гектараў на памідоры; жыла-была ў балоце жаба, а як мужчыну пабачыла – дык прывабнай жанчынай стала; адзін кароль лічыў сябе надта разумным (ажно дзве вышэйшых адукацыі), а аказаўся завершаным эксгібіцыяністам (ну, у сэнсе, голым любіў пры падданых шпацыраваць). Вось так і са славутай беларускай талерантнасцю ды памяркоўнасцю...




У літаратуры гэтым якасцям нашага народу амаль дыфірамбы співаюць. А ці не задумваліся Вы, пра што сведчаць гэтыя характарыстыкі? Чым насамрэч ёсць славутая беларуская талерантнасць і памяркоўнасць? Безумоўна, словы гэтыя на слыху ва ўсіх. Амаль кожны скажа, што талерантнасць – гэта паважлівыя адносіны беларусаў да іншых народаў нашай шматнацыянальнай і шматканфесійнай Радзімы. А праявы памяркоўнасці – гэта адсутнасць на Беларусі крывавых канфліктаў беларусаў з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў, якія пражываюць на нашай тэрыторыі. Прыкладна такія ж азначэнні сустракаюцца, як адзначалася вышэй, у падручніках савецкага часу.

Нездарма гэты "савецкі перыяд" быў выдзелены ў артыкуле двойчы: менавіта ў гэты час пачалі актыўна пашырацца словы талерантнасць і памяркоўнасць. Менавіта ў гэты час з'явілася мода на ўжыванне інверсійных (г.зн. адваротага значэння) тэрмінаў: дыктатар - бацька народа, інтэлігент - вораг, патрыёт - нацдэмавец, і г.д.

І менавіта ў гэты час такія падлейшыя рысы беларускага характару як памяркоўнасць ды талерантнасць пачалі набываць арэол святасці і ўсеагульнага захаплення.

Дык вернемся да пытання: "Што насамрэч ёсць талерантнасць і памяркоўнасць?"

У першую чаргу, талерантнасць – гэта павага да іншых нацыянальнасцяў і канфесій. А момантаў, каб даказаць гэта, у беларусаў было дастаткова.

Напрыклад, падзелы Рэчы Паспалітай. Вось тут на ўсю катушку праявілася нашая славутая талерантнасць і менталітэт. Канешне ж, мы, беларусы, не учынілі крывавай разні праваслаўным (на той момант беларусы былі ў большасці каталікі і ўніяты). Ды і навошта? Мы проста ўзялі ды змянілі рэлігію. А што? І памяркоўна, і па-беларуску (у сэнсе: і авечкі цэлыя, і ваўкі...). Адносна ваўкоў (у сэнсе – маскалёў-захопнікаў) і выявілася нашая памяркоўнасць: амаль з хлебам-соллю сустракалі Кацярыну ў Гародні. Слабенькім рэхам дакацілася да нас паўстанне Тадэвуша Касцюшкі.

Ці, напрыклад, вынікі паўстання 1863-1864гг.: калі вешалі Каліноўскага, уся плошча была запоўнена беларусамі. А што, і на людзей пагляздзець, і сябе паказаць. Мы ж не маглі тады абараніць чалавека, які змагаўся за НАШУ будучыню і краіну, мы ж – памяркоўныя ды талерантныя, мы любім людзей (асабліва ворагаў).

А вось яшчэ прыклад з мінулага стагоддзя адносна талерантнасці і памяркоўнасці нашых "славутых" пісьменнікаў: у часы Бацькі народаў (не блытаць з іншым!) П.Броўка, А.Куляшоў і кампанія склала адзін зборнічак прысвечаны "отцу народов и лучшему другу пролетариата". Як кажуць, без каментарыяў...

Вось такі мы народ, які лепш пакажа ў кішэні дулю, а крыўдзіцелю пацалуе ручку і сцерпіць або проста прамаўчыць. Мы ж талерантныя.

Усю другую палову XX стагоддзя беларусы маўчалі, каб захаваць сябе фізічна. І дамаўчаліся да таго, што страцілі мову. Дамаўчаліся да таго, што амаль няма з кім паразмаўляць на чыстай беларускай...

Дазгаджаліся, дамаўчаліся, дахаваліся.

Добра маўчым, шаноўныя...

**Л. Задума, Костусь**

## АДНЫМ РАДКОМ

### В.ВЯЧОРКА: – ТРЭБА АДРАДЖАЦЬ МОВУ!

На Асамблеі няўрадавых арганізацый, што праходзіла 1 траўня ў Менску, прысутнічаў спадар Вінцук Вячорка, кіраўнік Партыі БНФ "Адраджэньне". Наш карэспандэнт выкарыстаў магчымасць задаць спадару Вячорку некалькі пытанняў.

**– У нашых сённяшніх умовах якія вы бачыце найбольш дзейсныя напрамкі для папулярызацыі беларускай мовы?**

– Першае, што можа зрабіць кожны, – адстойваць сваё канстытуцыйнае права атрымання інфармацыі на беларускай мове. У дзяржаўных установах вам павінны прадстаўляць інфармацыю на абедзвюх мовах, але гэта не выконваецца. Па-другое, выкарыстоўваць віртульную прастору для папулярызацыі нашай роднай мовы. Сённяшні ўзровень беларускамоўнага Інтэрнэта вельмі высокі, да таго ж, гэта ледзь не адзінае месца, дзе можна не баяцца пераследу з боку ўладаў. І па-трэцяе, павышаць папулярнасць беларускамоўных калектываў.

**– Але гэта складана. Беларускамоўным спевакам перашкаджаюць. Ім не даюць праводзіць канцэрты, дзяржаўным выданням забараняюць асвятляць іх творчасць і г. д. Яскравы прыклад з Берасця – гурт «Сьцяна».**

– Музыкам варта шукаць кантактаў з Менскам. Вырывацца з мястэчковага ўзроўню, бо там яны больш уязвімыя. У сталіцы больш магчымасцей прасунуцца, там ёсць людзі, якія могуць дапамагчы.

**Dzedzich week-news**

### КАНТАКТУЙ З БМА!

Беларуская музыка на касетах і CD.
Толькі ў нас пастаянныя святочныя зніжкі!
Набудзь пяць дыскаў – шосты атрымаеш задарма!!! Магчыма дастаўка на дом.
Прапануем заробак распаўсюднікам у Менску і рэгіёнах.
Кантактуй з намі: 8 (0296) 49 08 88, pager: 211 85 85 аб. БМА. 220085, г. Менск, а/с 5, wital@tut.by, www.BMA.home.by.

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

## ПАРТЫЯ БНФ

**распачынае новую агульнагарадскую кампанію "Разам за еўрапейскі дабрабыт".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Разам мы:**

- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Адстаім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Ты зможаш:**

- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Навязаць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,**

каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**

**Тэлефануй: 23-68-02; (029) 641-20-98.**

## УВАГА!!!

**БАМГА "Сузор'е" абвяшчае дадатковы набор карэспандэнтаў у склад рэдакцыі ІАБ "ДЗЕДЗІЧ"**

**Студэнтаў, вучняў старэйшых класаў і ўсіх, хто жадае:**

**– Выказаць свае думкі,**
**– Навучыцца пісаць артыкулы,**
**– Зірнуць на акаляючы свет вокам журналіста,**
**– Стаць ля вытокаў стварэння новай моладзевай газеты,**

**просім звязацца з намі па тэл.: 23-68-02 з 12$^{00}$ да 21$^{00}$.**

**Маб.: (029) 660-57-41 (Дзмітрый), (029) 725-15-39 (Андрусь).**

**Таксама запрашаем да супрацоўніцтва мастакоў, карыкатурыстаў, фатографаў.**

# ПЕРЕВОД НА КОНТРАКТЫ – ЛИЧНАЯ ИНИЦИАТИВА ПРЕЗИДЕНТА ЛУКАШЕНКО

**«ВСЕ, ЧТО МЫ ДЕЛАЕМ, В КОНЕЧНОМ СЧЕТЕ ИМЕЕТ ЦЕЛЬЮ ПОВЫШЕНИЕ УРОВНЯ ЖИЗНИ БЕЛОРУССКИХ ГРАЖДАН». «МЫ» – ЭТО ПРЕЗИДЕНТ ЛУКАШЕНКО И ЕГО БЛИЖАЙШЕЕ ОКРУЖЕНИЕ. ПОГОЛОВНАЯ «КОНТРАКТИЗАЦИЯ» – ОЧЕРЕДНОЙ ПРИМЕР ТОГО, ЧТО РЕАЛЬНО ДЕЛАЕТ ВЛАСТЬ ДЛЯ «ПОВЫШЕНИЕ УРОВНЯ ЖИЗНИ БЕЛОРУССКИХ ГРАЖДАН».**

Её суть до неприличия прозрачна и элементарна: чем слабее у работника социальная защита, чем меньше правовых гарантий, тем покладистее он во взаимоотношениях с властью.

Казалось бы, за десять лет «просвещенного» правления белорусы насмотрелись всякого. Но, кажется, впервые народу навязывают проект, который своим цинизмом может соревноваться с нравами эпохи дикого капитализма двухсотлетней давности, когда «хозяева жизни» ставили трудового человека вровень с быдлом.

Лукашенко не скрывает своего авторства. По его прямому указанию Совет Министров подготовил поручение №30/14/102-925 от 09.01.2004г. о заключении контрактов с работниками. Однако тут же открылась постыдная юридическая несостоятельность этого требования. Дело в том, что поручение Совмина не является нормативно-правовым актом (в отличие от постановлений) и не относится к актам законодательства. Более того, поручение противоречит Декрету Президента № 29 от 26.07.1999г. «О дополнительных мерах по совершенствованию трудовых отношений, укреплению трудовой и исполнительской дисциплины». В декрете говорится лишь о ПРАВЕ нанимателей заключать контракты.

Кроме этого, начальники на местах, добиваясь от работников подписания контракта, ссылаются на указания вышестоящих организаций. В этой связи напомним, что требование вышестоящих структур об обязательном заключении контрактов идёт вразрез с уставами конкретных юридических лиц. Ибо в большинстве уставов выбор формы найма персонала отнесён к компетенции руководителя организации. Следовательно, вмешательство учредителей в решение подобных вопросов недопустимо.

Беззаконие, инициированное президентом, воодушевило многих администраторов. Используя новый порядок найма, они экономят на персонале, беззастенчиво ущемляя интересы трудящихся. Отпадает надобность применять процедуру сокращения (соответственно, не надо выплачивать выходные пособия и т. п.). Работник, «посаженный» на контракт, в случае увольнения лишается правовой защиты по весьма банальному основанию – истечению срока договора.

Инициатива Лукашенко противоречит и мировому опыту. Международная организация труда (МОТ) еще в 1982г. высказалась против неограниченного использования срочных трудовых договоров, поскольку они ставят работников в зависимость от нанимателя. Получается, что Беларусь, несмотря на членство в МОТ, отвергает рекомендации этой уважаемой организации. Нет, не случайно Лукашенко когда-то заявил: «Я за цивилизованным миром свою страну не поведу».

Даже Конституционный Суд РБ в своем решении (от 13.11.2001г.) был вынужден признать, что правовое положение работников, с которыми заключаются контракты, ухудшается. Но, желая подсластить пилюлю, КС отметил, что ухудшение правового положения (на случай досрочного прекращения контракта по вине нанимателя или в связи с истечением его срока) должно компенсироваться денежными выплатами. Горькая ирония заключается в том, что Совмин в 2002г. отменил выплату компенсации по второму основанию.

Впрочем, одна категория граждан все-таки получает компенсацию. И не шуточную. Это представители бюрократических структур.

Экономия на контрактных выплатах учителям, медикам разительно контрастирует с выплатами за счет бюджета по контрактам, которые заключаются с госслужащими. Чиновники получают уйму пособий. В частности, пособие на оздоровление при использовании отпуска. Пособие при выходе в отставку в размере трех среднемесячных зарплат. Более высокий размер пособия при сокращении численности или штата – до шести среднемесячных зарплат. Более высокую надбавку за стаж – до 40% должностного оклада.

И тут возникает вопрос: **а зачем, собственно говоря, Лукашенко все это нужно?** Ответ прост. Второй президентский срок истекает. Необходимо проводить референдум, а «нарисовать» в очередной раз нужные цифры будет непросто. Контракт – это способ управлять избирательными комиссиями. Из кого они состоят? В первую очередь из государственных служащих: учителей, врачей.

Кроме того, еще не всю государственную собственность чиновники поделили между собой. Контрактная система позволяет получить ее практически даром: предприятие доводится до банкротства, и всем работникам указывают на дверь. При этом никаких выходных пособий: «Все – вон!».

## ЧТО ДЕЛАТЬ, ЕСЛИ ВАМ ПРЕДЛОЖИЛИ ПОДПИСАТЬ КОНТРАКТ

Если наниматель решил перевести Вас на контракт, то он обязан предупредить об этом за месяц и обязательно в письменной форме. Один экземпляр уведомления должен остаться у Вас на руках, другой в канцелярии. Перевод на контракт должен быть мотивирован. Общая «контрактизация» страны таким поводом не является. Отсутствие обоснования перевода на контракт делает увольнение (при отказе работника подписать контракт) незаконным.

Если обоснование в уведомлении отсутствует, Вы можете уведомление не подписывать и подать на имя руководителя заявление с просьбой объяснить производственные, экономические и т.п. причины перевода на контракт. Одновременно подайте заявление в комиссию по трудовым спорам по поводу отсутствия обоснованных причин перевода на контракт. Хорошо, если Ваши коллеги одновременно подадут аналогичные заявления.

Помните: не допускается заключение контракта сроком менее чем на один год. Контракт должен содержать меры по дополнительному стимулированию работы (дополнительный отпуск на 5 дней и другие).

Там, где есть независимые профсоюзы, проводите внеочередные конференции для внесения в коллективный договор норм, защищающих работника. Где нет независимых профсоюзов, создавайте их, поскольку ФПБ выполняет заказ власти и не поможет вам.

**Планово-аналитическая группа НАРОДНОЙ КОАЛИЦИИ «ПЯЦ¨РКА ПЛЮС»**
**(Использованы материалы публикаций в газете «Народная воля» и др.)**

**Ад рэдакцыі:**

**У наступным нумары «Дзедзіча» нашы юрысты паспрабуюць прааналізаваць сітуацыю з кантрактнай сістэмай і даць парады на выпадак парушэння правоў працоўных пры пераводзе на кантракт.**

ВНИМАНИЕ!

## МЫ ПРИГЛАШАЕМ ВОЛОНТЁРОВ

### ДЛЯ ПОДДЕРЖКИ ДЕМОКРАТИЧЕСКИХ КАНДИДАТОВ НА ПАРЛАМЕНТСКИХ ВЫБОРАХ 2004г.

**– Вас не устраивает ситуация в стране, но вы верите, что её можно изменить;**
**– Вы устали верить обещаниям Лукашенко и поддерживаете демократическую оппозицию;**
**– Вы желаете внести свой вклад в возрождение независимой и процветающей Беларуси;**
**– Вам больше 18 лет, и вы можете посвятить часть своего времени избирательной кампании;**
**– Вы хотите приобрести навыки общения с людьми, умения убеждать, взглянуть на выборы изнутри: не как простой избиратель, а как активный участник событий –**

## НАМ НУЖНА ВАША ПОМОЩЬ!

**МЫ ГАРАНТИРУЕМ:**
**– проведение для вас образовательных семинаров, стажировок как в г. Бресте, так и в других городах Беларуси и за рубежом;**
**– обеспечение вас всеми необходимыми навыками ведения эффективной агитации;**
**– возможность продолжить свою политическую карьеру при нашей поддержке;**
**– создание дружеской атмосферы и знакомство с интересными людьми.**

**ЧТО МОЖНО ДЕЛАТЬ: сбор подписей, распространение листовок, расклейка плакатов, агитация, участие в создании предвыборной программы, наблюдение за выборами.**

## НАШИ КАНДИДАТЫ ПРОСЯТ ВАШЕЙ ПОДДЕРЖКИ!

**ЗВОНИТЕ НАМ В ЛЮБОЕ ВРЕМЯ ПО ТЕЛ:**
**23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39, 41-12-00, 20-57-41.**

**Брестская городская организация Партии БНФ**

# АСАМБЛЕЯ АПТЫМІСТАЎ

1 ТРАЎНЯ, КАЛІ ЎСЕ ПАДНЯВОЛЬНЫЯ «БЮДЖЭТНЫЯ» РАБОТНІКІ БЫЛІ САГНАНЫЯ НА ПЛОШЧАХ З НАГОДЫ "СВЯТА БЯСПЛАТНАЙ ПРАЦЫ", 185 ЧАЛАВЕК З'ЕХАЛАСЯ З РОЗНЫХ КУТКОЎ БЕЛАРУСІ Ў МЕНСК З НАГОДЫ СУПРАЦЬЛЕГЛАЙ. ЯНЫ СПЯШАЛІСЯ НА 5 КАНГРЭС НЕДЗЯРЖАЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

Кожны з іх прадстаўляў пэўнае грамадскае аб'яднанне, таму па колькасці дэлегатаў можна меркаваць аб агульнай лічбе НДА у нашай краіне. На жаль, з Берасцейскай вобласці прыехала ўсяго 26 чалавек.

Сярод галоўных пытанняў, якія вырашаліся, – удзел грамадскіх аб'яднанняў у парламенцкіх выбарах (кастрычнік 2004), паводзіны ўладаў у адносінах да актывістаў НДА і стварэнне Фонду ўзаемадапамогі для тых, з кім гэтыя ўлады павялі сабе не па-джэнтэльменску. Пытанні вострыя, таму і абмеркаванне выйшла напружаным.

## ПРАВАВЫ ЧАРНОБЫЛЬ

Прадстаўнік праваабарончага цэнтра "Вясна" А.Бяляцкі выступаў першым:

– Удзельнічаць ці не ўдзельнічаць у выбарах – такое пытанне перад дэмакратычнымі аб'яднаннямі не стаіць. Улада супрацьпаставіла сябе дэмакратычным прынцыпам. Таму кожны, хто лічыць сябе дэмакратам, павінен унесці свой пасільны ўнёсак у кастрычніцкую падзею. Што можна зрабіць? Дапамагчы кандытатам у зборы подпісаў, вылучаць назіральнікаў… Зразумела, што ў нашай краіне прававы Чарнобыль. Што назіральнікаў і зборшчыкаў подпісаў звальняюць з працы, што кандыдатаў не прапускаюць, што выбары будуць сфальсіфікаваныя падчас падліку галасоў, а назіральнікаў і блізка не падпусцяць… Але мы павінны дзейнічаць разам, і, калі супрацьстаянне будзе сапраўды агульным, то аніякія фармальнасці ўжо не здолеюць перашкодзіць.

Валерый Шчукін:

– Сейчас вот говорили, что, мол, наблюдатели не могут помешать фальсификации выборов. Да, действительно, если наблюдатель подходит к месту подсчета голосов, это расценивается как НАРУШЕНИЕ. Но фальсификация, которую там проводят – ПРЕСТУПЛЕНИЕ, которое вы можете предотвратить. Так что подходите вплотную, не давайте им врать. А если вас будут удерживать силой – кричите, переворачивайте столы, словом, срывайте выборы! Это называется гражданское неповиновение. Сопротивление ненасилием. Ну, посадят вас на пятнадцать суток, ну, посидите, и что страшного?! Зато на вашем участке либо будет правильный подсчет, либо не будет никакого! (працяглыя воплескі).

## АНАРХІЯ ЗВОНКУ І ЗНУТРЫ

Наступнае пытанне, што абмяркоўвалася на Асамблеі, было адным з самых набалелых. Гэта формы ўціску, якія прымяняе ўлада ў адносінах да арганізацыяў і іх сябраў. Удзельнікі дзяліліся сваім сумным вопытам. Амаль кожнаму было што сказаць.

У мінулым годзе берасцейскі рэсурсовы цэнтр "Вежа" зачынілі за тое, што арганізацыя пісала свой адрас як "вул. Савецкіх ПАМЕЖНІКАЎ" замест афіцыйнага "вул. Савецкіх ПАГРАНІЧНІКАЎ".

У гэтым жа годзе па Беларусі было зачынена каля 50 арганізацый па не менш "важкіх" прычынах. Але гэта не самае страшнае. Арганізацыя можа існаваць без афіцыйнай рэгістрацыі, але вельмі складана існаваць чалавеку без працы, асабліва ў сённяшніх умовах. Сябраў грамадскіх аб'яднанняў звальняюць з працы, а ў большасці з іх – сем'і, якія трэба карміць. Кантрактная сістэма яшчэ больш спрашчае працэдуру звальнення "идеологически чуждых элементов". Праваабарончы цэнтр "Вясна", які, дарэчы, таксама зачынілі ў мінулым годзе, прапанаваў звяртацца да яго ў выпадках незаконных звальненняў.

Размова на гэтую балючую тэму скончылася нечакана весела. На сцэну выйшаў доўгавалосы хлапец. Ен аказаўся дэлегатам наваполацкага аб'яднання анархістаў. З вялікай тугой на твары ён паскардзіўся, што ўлада вядзе сябе ў адносінах да іх арганізацыі проста прыкра. Хлопцам забараняюць насіць значкі з сімвалам "АНАРХІЯ". На пытанне "Што рабіць?" заля адказала дружным смехам і рэплікамі накшталт: "Нам бы вашыя клопаты!".

## ФОНД УЗАЕМНАЙ ДАПАМОГІ

На жаль, ніхто зараз не можа перашкодзіць уладзе саджаць людзей за краты, звальняць з працы і збіваць іх у маўпятніках (рас. "обезьянник"). Але ў нашых сілах зрабіць так, каб той, хто трапіў у мясарубку, адчуваў падтрымку.

На Асамблеі прагучала прапанова аб стварэнні асобнага Фонда, які б аказваў дапамогу тым, хто пацярпеў ад уладаў з-за сваёй грамадзянскай пазіцыі. Ідэя стварэння Фонду была горача падтрымана старшынёй Партыі БНФ Вінцуком Вячоркам:

– Гэта павінен быць Фонд, які будзе аказваць не толькі матэрыяльную падтрымку. Падтрымка павінна быць усебаковай. Дапамога ў пошуку працы, адпраўка дзяцей у аздараўленчыя лагеры і г.д.

У ліпені пачне фармавацца папячыцельны савет Фонду. Чакаем!

**Алеся ГАРДЭ**

# ЭСТОНИЯ ТРЕБУЕТ ОТ РОССИИ КОМПЕНСАЦИЮ ЗА ОККУПАЦИЮ

**Эстония намерена добиваться от России компенсации ущерба, нанесенного природе и населению этой балтийской республики за все годы, именуемые в стране "периодом советской оккупации". При этом в Эстонии надеются на политическую поддержку своего требования со стороны всех стран Евросоюза, членом которого бывшая республика СССР является с 1 мая нынешнего года.**

Подсчет размеров ущерба, нанесенного Эстонии гитлеровской Германией и Советским Союзом в период с 1940 по 1991 год, был поручен специальной государственной комиссии по расследованию репрессивной политики.

Ее главной задачей было составить как можно более полную картину того, как пострадала страна в тот период, который здесь принято называть "оккупационным". Работа комиссии продолжалась 12 лет, и недавно она представила парламенту Эстонии итоговый документ, названный "Белой книгой".

"Мы представили отчет об ущербе, нанесенном Эстонии как за годы советской власти, так и вследствие оккупации Германией. Но так как период немецкой оккупации был сравнительно недолгим, то основное внимание уделено советскому периоду", — сообщил председатель государственной комиссии Велло Сало, профессор Торонтского университета.

По данным расследования комиссии, в ходе репрессий Эстония потеряла 180 тыс. человек, что составляет 18% от общего числа населения, а пребывание Советской армии нанесло природе страны катастрофический ущерб.

По мнению профессора Сало, у России следует потребовать компенсацию за каждую человеческую жизнь и разрушенную судьбу. В качестве примера профессор привел опыт Германии, которая выплачивает компенсации всем, кто был угнан на принудительные работы в "Третий рейх".

Жизнь каждого эстонца Велло Сало оценивает в 1 млн. крон (75 тыс. долларов). Именно во столько профессор оценивает конкретную пользу, которую в течение своей жизни гражданин приносит своему государству. Более того, у господина Сало есть предложение о том, как Россия может рассчитаться с Эстонией за грехи СССР.

"Пусть, например, в наше пользование отдадут Новосибирскую область, на территории которой в течение определенного количества лет мы могли бы делать лесозаготовки", — сообщил профессор газете Eesti Paevaleht.

Парламенту также представлены точные данные в отношении загрязнения окружающей среды Эстонии в советскую эпоху. Ущерб, нанесенный экологии страны советскими войсками, дислоцированными в республике до 1991г., составляет 4 млрд долларов. Эта цифра возникла не случайно, а явилась результатом проводившихся несколько лет научных исследований.

"Россия, правопреемница СССР, перед нами еще даже не извинилась, — подчеркнул Велло Сало. — Поэтому Эстония прежде всего должна добиваться от России признания вины Советского Союза за оккупацию. Четкое признание несправедливости очень важно как для Эстонии, так и для Европы и всего мира".

Эстонский парламент, принявший "Белую книгу" к рассмотрению, объявил о том, что намерен впредь добиваться признания советского коммунистического режима преступным. Что же касается нацистского режима, пребывание войск которого в Эстонии было "непродолжительным", то по отношению к нему балтийские парламентарии столь обличительного негодования не высказывают.

Более того, в феврале 2000г. указом президента Леннарта Мери 19 эстонских ветеранов полков СС были отмечены высшей наградой Эстонии — "Орлиным крестом".

Собираясь обратиться к ЕС и другим международным сообществам, Эстония предпочитает не вспоминать об определении Международного трибунала в Нюрнберге, признавшего СС преступной организацией, совершавшей систематические преступления против человечности.

23 августа 1939г. был заключен пакт о ненападении между СССР и Германией. По плану раздела Европы Эстония попала в зону влияния СССР. В июне 1940г. в Эстонию введены советские войска. 6 августа 1940г. Эстония провозглашена республикой в составе СССР. С июля 1941-го по сентябрь 1944г. территория Эстонии занята частями вермахта и войсками СС. До 1991г. Эстония оставалась советской республикой.

В сентябре 1991-го Москва признала независимость трех балтийских республик.

**Newsru.com**

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ЧЭРВЕНЬ:

## 1 ЧЭРВЕНЯ

1 чэрвеня – **Міжнародны дзень абароны дзяцей.**

## 2 ЧЭРВЕНЯ

Сёння, у пэўным сэнсе гэтага слова, садысцкі дзень. 2 чэрвеня 1740г. нарадзіўся французскі пісьменнік **маркіз дэ Сад**, ад прозвішча і сэксуальных прыхільнасцяў якога паходзіць тэрмін "садызм". Цяпер ён шырока ўжываецца не толькі ў дачыненні да сэксу, але і да іншых сфераў жыцця, у тым ліку і да паводзінаў дыктатарскіх рэжымаў.

Дзве наступныя каляндарныя даты – з гэтага шэрагу. 2 чэрвеня 1962г. у **Навачаркаску** ва Украіне савецкія ўлады расстралялі мірную дэманстрацыю рабочых. А 2 чэрвеня 1989г. на плошчы **Таньаньмынь** у Пекіне супраць мірнай студэнцкай дэманстрацыі былі кінутыя танкі. Больш за сто дэманстрантаў загінула. Сапраўды садысцкі дзень у нашым календары.

## 5 ЧЭРВЕНЯ

5 чэрвеня – **Дзень Ефрасінні Полацкай** і **Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя**.

## 6 ЧЭРВЕНЯ



6 чэрвеня 1841г. у маёнтку Мількаўшчына ў сям'і заможнага памешчыка і вядомага юрыста Бенедыкта Паўлоўскага, які меў багатую бібліятэку ды лічыўся "вальнадумцам і вальтэрыянцам", нарадзілася будучая пісьменніца **Эліза Ажэшка**. Бацька памёр, калі Элізе было тры гады. У хаце яна атрымала першапачатковую адукацыю, родныя яе ласкава называлі Зюня. Затым юная Эліза вучылася ў адным з варшаўскіх пансіёнаў, дзе пазнаёмілася з будучай паэткай Марыяй Канапніцкай. Праз год пасля заканчэння пансіёну маці выдае яе замуж за памешчыка Пятра Ажэшку. Шлюб адбыўся 21 студзеня 1858г. у гарадзенскім Бернардзінскім касцёле. Эліза пераязджае з мужам у ягоны маёнтак Людвінава (цяпер вёска Попіна Драгічынскага раёну), дзе шмат чытае і знаёміцца з жыццём простага люду, жадае працаваць на ягоную карысць і адкрывае школку для вясковых дзетак. Вірлівыя падзеі 1863г. аказалі значны ўплыў на светапогляд Элізы Ажэшкі. Пасля паразы паўстання яна пераязджае ў разрабаваны царскімі войскамі свой радавы маёнтак Мілкаўшчыну, дзе цалкам аддаецца літаратурнай творчасці. Яе мужа саслалі на тры гады ў Пермскую губерню, а маёнтак Людвінава канфіскавалі. У 1869г. пісьменніца разводзіцца з Пятром Ажэшкам, прадае свой маёнтак і перасяляецца ў Гародню, дзе і пражыла большую частку жыцця...

6 чэрвеня 1905г. у в. Пуцілкавічы на Ушаччыне нарадзіўся **Пятрусь Броўка**, народны паэт Беларусі. Пра гэткіх людзей казаць заўсёды цяжка. Акадэмік, галоўны рэдактар выдавецтва "Беларуская савецкая энцыклапедыя", старшыня Саюза пісьменнікаў...

## 7 ЧЭРВЕНЯ

7 чэрвеня 1880г. нарадзіўся **Вацлаў Іваноўскі**. ¨н прыйшоў на свет у шляхецкай сям`і ў маёнтку Лябёдка, недалёка ад мястэчка Васілішкі Лідскага павету. Рана ўсвядоміў сябе як беларус. У часе вучобы ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце ў 1902г. з групай аднадумцаў спрабаваў наладзіць выданне на гектографе падпольнай газеты "Свабода" як перыядычнага органа Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі. У 1906г. ўзначаліў славутую выдавецкую суполку "Загляне сонца і ў наша ваконца" ў Пецярбургу. У ліпені 1913г. Іваноўскі пераехаў у Вільню, дзе стаўся старшынёю Беларускага выдавецкага таварыства. За два гады яно выдала 14 кніг агульным накладам блізу 45 тысячаў асобнікаў. Адначасова з актыўным удзелам у нацыянальна-вызвольным руху Іваноўскі займаўся навуковай дзейнасцю. У 1909г. у Мюнхене абараніў доктарскую дысертацыю і да 1913г. быў дацэнтам Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Вацлаў Іваноўскі стварыў першы падручнік неарганічнай хіміі для ВНУ на беларускай мове, шмат зрабіў у распрацоўцы нацыянальнай навуковай тэрміналогіі. У 1918г. ён – міністр асветы Беларускай Народнай Рэспублікі, рэктар Менскага педагагічнага інстытута. Да актыўнай палітычнай дзейнасці вярнуўся ў часе Другой сусветнай вайны. Акупацыю Беларусі разглядаў як часовую з'яву. Арыентаваўся на заходніх праціўнікаў Гітлера, а ў сувязі з гэтым – на польскі эміграцыйны ўрад у Лондане, разлічваючы на федэрацыю Беларусі і Польшчы ў паваенай Еўропе. 6 снежня 1943г. Іваноўскі быў паранены на адной з вуліц Менска. Пакінуты ў шпіталі без лекарскай дапамогі, ён назаўтра памёр.



## 10 ЧЭРВЕНЯ

У 1812г. была адчынена **Полацкая езуіцкая акадэмія**.

У гэты самы дзень 1562г. у Нясвіжскай друкарні С.Будны выдаў **"Катэхізіс"**, першую кнігу на старабеларускай мове на тэрыторыі Беларусі.

Катэхізіс (ад грэчаскага – «навучанне, вуснае настаўленне») – рэлігійная кніга, выкладанне асноў хрысціянскай веры ў форме пытанняў і адказаў. Спачатку слова катэхізіс абазначала вуснае настаўленне тых, хто пераходзіў у хрысціянства. З XVIст. катэхізіс – навучальны дапаможнік, які павінен быў даць вернікам агульнае паняцце аб рэлігійных канонах, рэлігійным вучэнні. Такія выданні запачаткаваў Марцін Лютэр, які ў 1529г. надрукаваў "Малы катэхізіс". У 1566г. у Ватыкане выйшаў "Рымскі катэхізіс". С. Будны выдаў свой "Катэхізіс" у 1562г.


КАТИХИЗІСЪ
ТО ЕСТЬ,
НАУКА СТАРОДАВНАЯ ХРІСТІАНЬСКАЯ Ѿ СВЕТОГО ПИСМА, ДЛЯ ПРОСТЫХЪ ЛЮДЕЙ ЯЗЫКА РУСКОГО, ВЪПЫТАНЯХЪ И ѾКАЗЕХЪ СОБРАНА.
Ѿ ПЕРЪВАГО СВЕТОГО АПОСТОЛА Петра посланія Зачало

Кніжка вельмі падобна на выданні Ф. Скарыны: фармат у 4-ую долю аркуша, шрыфт вельмі падобны на скарынаўскі, двухколерны друк выкарыстаны толькі ў тытульным аркушы, астатні набор зроблены чорнай фарбай. Гэта дало падставу даследчыкам (В.Шматаў) сцвярджаць, што С. Будны арыентаваўся на Ф. Скарыну. Аформлены "Катэхізіс" Буднага так: застаўка на тытуле, канцоўка, дробныя ўпрыгожанні на старонках, трапляецца вязь (яе нагадваюць вялікія літары кожнага раздзела). "Катэхізіс" Буднага напісаны ў форме пытанняў і адказаў: пра дзесяць запаведзяў, пра сімвал веры, пра Гасподнюю малітву і пра таінствы. Выданне адрасавалася шырокім колам беларускага насельніцтва і мела мэтаю яго адукацыю: "Абы вси слова божия и истины разумниа жаждущим мели чого бы ся и сами учили и деток своих научали". У прадмове да "Катэхізіса" выказана любоў да беларускай мовы, спадзяванне, што Радзівілы, якія пераважана гаварылі па-беларуску, не толькі будуць любіць і шанаваць сваю, якая мае вельмі даўнюю і слаўную гісторыю.

## 13 ЧЭРВЕНЯ

Сёння нарадзіўся **М.К. Радзівіл Рыбанька** (1702-1762), магнат, дзяржаўны дзеяч.

"Дзякуй Богу... Скончылася мне 47 год сёння. Былі мы на набажэнстве, а пасля яго выправіліся да ставу і з грэблі назіралі за флатыліяй. Яцак Вішнявецкі, мой карлік, быў адміралам і да мяне звярнуўся з вершаваным прывітаннем. Адтуль паехалі да тэатра, дзе прадстаўлялася вельмі цікавая камедыя Салона. Потым – вячэра і прыгожы феерверк з ілюмінацыяй. Так шчасліва прайшоў дзень, дзякуючы клопатам маёй жонкі".

Міхаіл Казімір Радзівіл Рыбанька – гетман вялікі Літоўскі, ваявода віленскі. Яго без перабольшвання можна назваць выдатным прадстаўніком Асветніцтва. Адным з першых у 40-50-я гг. XVIIст. ён распачаў энергічныя культурна-асветніцкія і гаспадарчыя новаўвядзенні. Знакамітыя мануфактуры слуцкіх паясоў, нясвіжскіх дываноў, шпалераў, урэчскага шкла пры ім дасягнулі найбольшага росквіту. Створаныя на іх мастацкія шэдэўры і зараз упрыгожваюць лепшыя музеі свету. У той час у Нясвіжы адкрылася вайсковая школа, аднавіла працу друкарня, значна папоўніліся бібліятэка, архіў, карцінная галерэя, іншыя калекцыі. Еўрапейскую вядомасць атрымаў Нясвіжскі тэатр, галоўнай апякункай якога, а таксама аўтарам шматлікіх п'ес для яго рэпертуару была Францішка Уршуля, жонка князя Міхала.

Іх сямейны саюз, нягледзячы на выпрабаванні (памерла некалькі дзетак), быў шчаслівым. "Франуся" і "Міхасенька" вельмі кахалі адзін аднаго. А чаму князь Міхал меў мянушку "Рыбанька"? Проста любіў выкарыстоўваць гэтае слова ў звароце да субяседніка.

## 14 ЧЭРВЕНЯ

14 чэрвеня нарадзіўся **М.В. Доўнар-Запольскі** (1867-1934), беларускі гісторык, этнограф і фальклярыст.

## 16 ЧЭРВЕНЯ

16 чэрвеня – **Дзень медыцынскага работніка.**

## 20 ЧЭРВЕНЯ

20 чэрвеня 1566г. нарадзіўся **Жыгімонт III Ваза**, вялікі князь Літоўскі, кароль Польшчы і Швецыі. ¨н быў абраны на пасад Рэчы Паспалітай у 1587г. пры падтрымцы сярэдняй шляхты, якая

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# ЛЮДЗІ І ПАДЗЕІ

пазней не падтрымала яго. А са шведскага трону ён быў сагнаны ў 1599-м пратэстантамі. Каб вярнуць сабе Шведскае каралеўства, ён вёў доўгія і бясплённыя войны, у выніку чаго нашыя продкі плацілі дарагой крывёю, а дзяржава наша страціла частку Інфлянтаў, то бок паўднёвай Латвіі. Але з імем гэтага манарха звязаныя і дзве эпахальныя даты нашай гісторыі, якія на стагоддзі перадвызначылі і лёс Беларусі, і лёс беларускай культуры. Менавіта вялікім князем Жыгімонтам III быў зацверджаны ў студзені 1588г. Статут Літоўскі – звод законаў, што быў на той час самым перадавым у Еўропе. Статут рыхтавалі найлепшыя правазнаўцы ВКЛ пад кіраўніцтвам выдатных дзяржаўных дзеячоў-беларусаў – канцлера Астаха Валовіча і падканцлера Льва Сапегі. Заканадаўчай асноваю новага зводу былі ранейшыя Статуты 1529 і 1566гг., вялікакняскія прывілеі, пастановы соймаў.



**Гравюра Э.Кайзера**

Жыгімонт Ваза быў і адным з самых гарачых прыхільнікаў вуніі паміж хрысціянамі ўсходняга абраду і Рымам. Ідэя вуніі ажыццявілася ў 1596г. на Берасцейскім царкоўным саборы. Беларускія і ўкраінскія праваслаўныя ўладыкі прызналі вяршэнства Рымскага Папы, але захавалі ранейшыя "грэцкія" абрады. Вялікі князь Жыгімонт адразу выдаў прывілей пра зраўнанне ў правах грэка-каталіцкага духавенства з рымска-каталіцкім і пра вечную падтрымку вуніяцкай царквы каралеўскаю ўладай.

За часоў Жыгімонта Вазы нашая дзяржава была ўплішчаная ў вялікую авантуру – інтэрвенцыю ў Расею. На думку гэтага манарха ўсяляк трэба было падтрымліваць Ілжэдзімітрыя І. Затым ён імкнуўся пасадзіць на Крамлі свайго сына Уладзіслава. Пры актыўнай падтрымцы маскоўскага баярства сілы Рэчы Паспалітай у 1610г. увайшлі ў Маскву, потым штурмам авалодалі Смаленскам. Жыхары Масквы прызналі каралевіча Уладзіслава сваім валадаром. Толькі праз два гады шырокага вызваленчага руху расейцам удалося вызваліць Маскву. Але гэтым барацьба не скончылася, і дзяржавы яшчэ доўга знаходзіліся ў стане вайны. Жыгімонт Ваза спрабаваў вярнуць сваму сыну Уладзіславу маскоўскі пасад. Дзеля гэтага мабілізаваліся сілы ў Вялікім Княстве і рыхтаваўся новы паход. У 1617г. гетманы Хадкевіч і Гасеўскі паспрабавалі дайсці да Масквы. Ізноў інтэрвенцыю падтрымалі шырокія колы апазіцыі да маскоўскага цара, у прыватнасці "вольнае" казацтва. Аднак працяглая вайна знясіліла абодва бакі. У тых умовах Вялікае Княства і Польскае Каралеўства прапанавалі Маскве падпісаць замірэнне. У выніку той кампаніі Рэч Паспалітая здолела вярнуць сабе Смаленск. Больш за тры дзесяцігоддзі каралявання Жыгімонта III сталі той самай эпохаю, у часе якой адбыліся каласальныя культурныя і палітычныя змены, што прадвызначылі аблічча нашага краю на стагоддзі.

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 21 ЧЭРВЕНЯ



21 чэрвеня 1741г. у французскім горадзе Ліёне нарадзіўся **Жан Жылібер**, славуты натураліст, батанік, хірург і анатам. Скончыўшы універсітэт у Манпелье, ён доўгі час працаваў у Ліёнскім каледжы. На запрашэнне падскарбія вялікага літоўскага Антонія Тызенгаўза ў 1775г. пераехаў у Беларусь, дзе ў Горадні заснаваў медычную акадэмію. Тамсама заснаваў Жылібер акушэрскую і ветэрынарную школы, клінічны шпіталь, заклаў таксама першы ў гісторыі Рэчы Паспалітай батанічны сад на Гарадніцы, рэшткі якога можна пабачыць і сёння. Ад 1781г. жыў ён у Вільні на вуліцы Замкавай, што цяпер завецца Пілес. Тут ён працаваў прафесарам натуральнай гісторыі ў будучым Віленскім універсітэце, што тады зваўся проста Галоўнай школаю Вялікага Княства Літоўскага. Ад 1783г. ён ізноў жыў у сваёй роднай Францыі. Там ён напісаў дзясяткі навуковых прац пра флору Беларусі і Літвы, а таксама пра эпідэміялогію заразных хваробаў у нашых краях.

21 чэрвеня 1937г. памёр **Мікалай Галадзед**, адзін з заснавальнікаў камуністычнай партыі ў Беларусі, савецкі дзяжаўны дзеяч. Нарадзіўся ён на Браншчыне ў 1894г. Удзельнічаў у расейскай рэвалюцыі 1917г. і грамадзянскай вайне. Быў другім сакратаром Кампартыі Беларусі. Ад траўня 1927-га і да траўня 1937-га, роўна 10 гадоў ачольваў Савет Народных Камісараў Беларусі.

Цікавая дэталь да партрэту беларускіх камуністычных дзеячоў. Праз тыдзень пасля разбурэння ў Менску катэдральнага Свята-Духава сабору, у траўні 1936г., пачалі падрываць Свята-Казанскі (прывакзальны) мураваны храм. На работу падрыўнікоў, як на свята, прыйшлі паглядзець кіраўнікі беларускага ўраду, сярод якіх былі Гікала, Чарвякоў і той самы Галадзед. Для зручнасці яны размясціліся на балконе левага крыла Дома ўраду. Каб бачнасць была добрай, выбух прызначылі на шэсць гадзінаў раніцы, на досвітку. Пасля таго, як ён прагрымеў, будынак Свята-Казанскага сабору перастаў існаваць. Сам Мікалай Галадзед быў арыштаваны НКУС у Маскве і падчас допыту ў Менску выкінуўся з вакна на вуліцу.

### 22 ЧЭРВЕНЯ

У гэты дзень фашысцкая Нямеччына напала на СССР.

### 24 ЧЭРВЕНЯ

У гэты дзень, 24 чэрвеня 1767г. у вёсцы Асташына, што на Навагарадчыне, нарадзіўся **Стафан Грабоўскі**, выдатны вайскаводзец і палітык, адзін з кіраўнікоў паўстання Касцюшкі. Атрад пад яго-ным кіраўніцтвам адыграў вырашальную ролю падчас захопу паўстанцамі Вільні ў красавіку 1794г.

Але перамога над расейцамі была часоваю. Падпалкоўнік Стафан Грабоўскі ізноў зрабіў у канцы жніўня – пачатку верасня адчайную спробу палепшыць справы паўстанцаў ужо пасля страты Вільні. 17 жніўня яго амаль 2-хтысячны аддзел з дазволу Мар'яна Вяльгорскага каля Івянца ўвайшоў у "закардонную" Меншчыну. Планаваўся захоп Менска. Але і гэтым разам удача адвярнулася ад паўстанцаў, бо расейскі гарнізон у Менску атрымаў значнае падмацаванне.

Тады, сышоўшы з ракаўскага гасцінца, аддзел Грабоўскага ў абыход гораду праз Койданава рушыў да Пухавічаў. Па дарозе паўстанцы грамілі расейскія каманды, разбуралі масты, рабілі засекі на дарогах. Паводле сведчання начальніка расейскага войска ў Вялікім Княстве Літоўскім Рэпніна, у паўстанцаў не было праблемаў з забеспячэннем харчамі і фуражом. Па дарозе амаль на паўтары тысячы чалавек папоўніўся лік "грабоўчыкаў". Мясцовае насельніцтва спрыяла іх маршу. І гэта больш за ўсё непакоіла Рэпніна, які наогул не мог уцяміць "дерзостного стремления сих мятежников". А тыя яшчэ на вайсковай радзе ў Пухавічах вырашылі ісці ў глыб Беларусі: або "прапасці", або ажывіць прыгаслае паўстанне.

30 жніўня авангард паўстанцаў дайшоў да Бабруйска. Начным нападам горад быў заняты, а мясцовы гарнізон знішчаны. Ад Бабруйска Грабоўскі павярнуў назад, намерваючыся захапіць Слуцак. Але пад Любанню шлях яму з чатырохтысячным войскам перагарадзіў генерал Цыцыянаў. 4 верасня раніцою пачалася бітва, якая ішла цэлы дзень. Пры гэтым Грабоўскі апынуўся там амаль без пяхоты і значнай часткі конніцы, якія не паспелі напярэдадні пераправіцца цераз раку Арэсу. Паўстанцы біліся мужна, але сілы былі занадта няроўныя. З часткаю свайго аддзелу на 250 чалавек Грабоўскі вымушаны быў капітуляваць.

Сам Касцюшка рэйд Грабоўскага на той час не лічыў неабходным. Даведаўшыся пра яго, ён запатрабаваў, каб паўстанцы выйшлі з "расейскага кардону", адцягнулі свае сілы пад Берасце і Горадню. Тым не менш, той факт, што на нейкі час аддзелу Грабоўскага ўдалося адцягнуць на сябе да 4 тысячаў расейскага войска ў Беларусі, ужо сведчыў сам за сябе. Пасля капітуляцыі Грабоўскі быў арыштаваны і сасланы ў Расею. Пасля амністыі вярнуўся на Бацькаўшчыну. У 1812г. браў чынны ўдзел у паходзе Напалеона супраць Расеі. Ізноў патрапіў у расейскі палон. Але дзякуючы заступніцтву князя Чартарыскага не толькі вярнуў сабе свабоду, але і стаў дырэктарам гэтак званай Вайсковай камісіі Царства Польскага... Стафан Грабоўскі даслужыўся да пасады члена Дзяржаўнай Рады Расейскай імперыі, у якой засядаў 7 гадоў. Але вярнуўся на Радзіму, дзе і памёр у 1847г., ва ўзросце 80-ці гадоў.

У гэты дзень, 24 чэрвеня 1812г., пачалася вайна арміі Напалеона з Расеяй. За Напалеонам ужо была Польшча. Лішне казаць, што французска-расейская вайна адбывалася пераважна на Беларусі. Паўмільённае войска Банапарта фарсіравала Нёман. Цару Аляксандру І паведамілі пра гэта, калі ён танчыў на балі ў Вільні. Праз чатыры дні былая сталіца ўжо вітала французскага імператара. Роўна праз месяц пасля Вільні ён уступіў у Віцебск. Нягледзячы на цяжкія страты ды ваенныя няўдачы пад Кобрынем, Мірам і Полацкам, Банапарт прайшоў ад памежнага Нёмана сотні вёрстаў і набыў пяць мільёнаў новых падданых. Усведамленне гэтага дапамагала асправэчыць думкі і пра частае дэзертырства, і пра сялянскія бунты, і пра тое, што ў яговых беларускіх палках замест сотні тысячаў жаўнераў у лепшым разе толькі чвэрць гэтага, і тым бракуе рыштунку і зброі. Па беларускіх вёсках, пакідаючы за сабой

**(Заканчэнне на с. 8)**

# ЧЭРВЕНЬ: ЛЮДЗІ І ПАДЗЕІ

**(Заканчэнне. Пачатак на с. 6)**

пустыя хлявы і адрыны, гойсалі рэквізітары. Паколькі землі былога Вялікага Княства Літоўскага Напалеон лічыў вызваленымі з-пад расейскага прыгнёту, была ўтвораная Камісія Часовага Ураду Вялікага Княства. Яна прысягнула на вернасць імператару, гэта значыць, што Беларусь фармальна была абвешчаная саюзніцаю Францыі. Напалеонаўская авантура каштавала Беларусі мільён яе жыхароў, кожнага чацвертага. Адныя загінулі ў баявых дзеяннях, другія – ад голаду і пошасцяў. Частка беларускіх палкоў Вялікай арміі, у якіх служылі 25 тысячаў нашых суайчыннікаў, была разбітая, частка адступіла і ваявала ў Еўропе – на чужыне і за чужыя інтарэсы.

## 26 ЧЭРВЕНЯ

Сёння ў календары шмат міжнародных дзён. **Міжнародны дзень барацьбы з наркаманіяй**, які адзначаецца з 1988г., і **Міжнародны дзень Арганізацыі Аб`яднаных Нацыяў у падтрымку ахвяраў катаванняў**, які пачалі адзначаць у 97-м. А яшчэ – **Дзень свабоды Паўднёвай Афрыкі** і **Дзень незалежнасці Рэспублікі Мадагаскар**.

У праваслаўных хрысціянаў сёння пачатак **Пятрова паста**, які завершыцца 12 ліпеня.

26 чэрвеня 1953г. быў зняты з усіх пасадаў і арыштаваны намеснік старшыні Савета Міністраў СССР і міністр унутраных справаў **Лаўрэнці Берыя**. У гэты самы дзень яго аб`явілі "ворагам народа". У афіцыйным паведамленні было сказана, што Берыя – з даўніх часоў ангельскі шпіён і галоўны вінаваты ў масавых рэпрэсіях. Цікавая дэталь, што за часамі Берыі ў рэспубліках Савецкага Саюза начальскія пасады сталі займаць прадстаўнікі карэннай нацыянальнасці, у Беларусі ягонае праўленне адзначанае кароткай беларусізацыяй. Арыштаваў Берыю асабіста маршал Жукаў. "Хацеў засадзіць усю краіну, – сказаў ён – цяпер адкажаш за ўсё". Гэтак на Берыю імкнуліся зваліць усю адказнасць Сталіна за вынішчэнне народаў. Згодна з афіцыйнай версіяй, Берыя быў расстраляны неўзабаве пасля арышту ў 1953г.

## 27 ЧЭРВЕНЯ

Сёння **Сусветны дзень рыбалоўства**, які адзначаецца з 1984г. Дзякуй Богу, рэчак, азёраў ды сажалак у нашых краях хапае. Вось жа сёння можна вудаліць з адчуваннем сусветнай значнасці свайго занятку.

27 чэрвеня 1693г. у Лондане пачаў выходзіць першы ў свеце **часопіс для жанчын**. Сёння і ў нас такіх часопісаў багата, а тады ў ВКЛ усіх займалі толькі мужчынскія справы.

27 чэрвеня 1929г. у савецкай Расеі прынята рашэнне разгарнуць сетку папраўча-працоўных лагераў па ўсёй краіне – яшчэ толькі стваРаецца чорнай памяці ГУЛАГ.

У гэты ж дзень, 27 чэрвеня таго самага 1929г., у Нью-¨рку ўпершыню ў свеце дэманструецца **каляровае тэлебачанне**.

27 чэрвеня 1964г. у Вашынгтоне адкрыты **помнік Тарасу Шаўчэнку**. Статуя ўкраінскага кабзара ў поўны рост размясцілася ў вельмі ўтульным кутку ў самым цэнтры амерыканскай сталіцы. З аднаго боку ад яе – пратэстанцкая бажніца, з другога – піўны бар, унікальны, бо ў ім можна набыць піва амаль з любой краіны свету, нават з В'етнама і Тайланда. ¨сць там і літоўскі Калнапіліс, а вось беларускага піва няма.

На лаўцы пад постаццю Тараса Шаўчэнкі, як правіла, адпачывае ў гарызантальнай паставе асоба негрыцянскай нацыянальнасці, але няпэўнага полу. Верагодна, не раз яна спрабавала прачытаць надпіс на помніку вялікага ўкраінца, ды мабыць так і не змагла. А мы з вамі зможам. Вось гэты надпіс:

*"коли ми діждемося Вашингтона*
*з новим і праведним законом?*
*А діждемось таки колись!"*

Як кажуць у такіх выпадках, словы кабзара не страцілі сваёй актуальнасці. Не дачакалася пакуль Украіна свайго Вашынгтона. І Беларусь не дачакалася.

Магчыма, трэба яшчэ пачакаць. Бо словы прарока рана ці позна мусяць збывацца, на тое ён і прарок.

## 28 ЧЭРВЕНЯ

**Дзень памяці Янкі Купалы.** Пісьменнікі і проста грамадзяне ў гэты дзень традыцыйна ўскладаюць кветкі да помніка Купалу на Вайсковых могілках у Менску. Між тым, таямніца смерці песняра застаецца нераскрытаю. Купала загінуў 28 чэрвеня 1942г. у маскоўскім гатэлі "Масква". Паэт вяртаўся з вечарыны з іншымі пісьменнікамі ў свой нумар і па дарозе ўпаў у лесвічны пралёт. Нехта быццам бы бачыў, як пасля гэтага з гатэлю выбягалі нейкія людзі... Цэлыя кнігі пра гэтую трагічную смерць напісалі Барыс Сачанка і Георгі Колас, але ўсе версіі так і засталіся адкрытымі: самагубства, КДБ, нямецкія агенты... Вельмі няўтульнае, прызнаюся, пачуццё, калі народ не толькі не зберог свайго найвялікшага паэта, але і нічога не ведае пра прычыны ягонай гібелі. Сяржук Сокалаў-Воюш прысвяціў гэтай падзеі выразны верш, дзе ёсць такое рытарычнае запытанне: "Мо быў улетку галалёд у тым гатэлі?" Магчыма, таямніца гібелі Янкі Купалы раскрыецца разам з адкрыццём архіваў КДБ, якія сёння ў Беларусі не даступныя нікому. Будзем спадзявацца хоць бы на гэта.

Сёння ў 1914г. сербскі студэнт Гаўрыла Прынцып у Сараеве ўчыніў **замах на Франца Фердынанда**, спадкаемцу аўстрыйскага пасаду. Гэтае забойства зрушыла цэлы ланцуг падзеяў, у выніку якіх праз месяц пачалася Першая сусветная вайна. Такія тэрарысты, як Гаўрыла Прынцып, часам робяцца кумірамі лявацкай моладзі. Нашы беларускія анархісты ў звязку з гэтым згадваюць беларускага студэнта Ігната Грынявіцкага, які кінуў бомбу ў расейскага цара Аляксандра II. Аднак жа прыклад сербскага Гаўрылы паказвае, што няма тут чым захапляцца, бо забіў тэрарыст аднаго, а загінулі ў выніку мільёны.

Цікава, што і скончылася Першая сусветная вайна таксама сёння. 28 чэрвеня ў Версалі пад Парыжам была падпісаная **мірная дамова** паміж Нямеччынай і краінамі Антанты.

А яшчэ сёння нарадзілася шмат добрых людзей, якія ні ў каго бомбаў не кідалі, затое пакінулі пасля сябе кнігі і карціны, якія мы з цікавасцю чытаем і разглядаем дагэтуль. Напрыклад, у 1577г. нарадзіўся знакаміты фламандскі жывапісец **Рубенс**, а ў 1712г. нарадзіўся французскі філосаф **Жан Жак Русо**, які сказаў некалі: "Чалавек нарадзіўся свабодны, але паўсюль носіць кайданы". Таксама 28 чэрвеня ў 1867г. прыйшоў на свет італьянскі пісьменнік і драматург **Луіджы Пірандэла**, які ў 1934г. стаў нобелеўскім лаўрэатам.

Зрэшты, і ў спісе народжаных сёння светлых асобаў ёсць лыжка дзёгцю – гэта асабісты сакратар Гітлера **Рудольф Гес**, які таксама нарадзіўся 28 чэрвеня, у 1894г.

## 29 ЧЭРВЕНЯ

29 чэрвеня 1900г. нарадзіўся французскі пісьменнік **Антуан дэ Сэнт-Экзэпюры**. Чытаць яго пачынаюць з дзяцінства ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Беларусі. Экзэпюры шмат і добра перакладаўся на беларускую мову. А пачынаў ён сваю кар`еру як лётчык, асвойваў новыя трасы ў Афрыцы над Сахарай, над Атлантыкай і Лацінскай Амерыкай. У чэрвені 1944-га Экзэпюры не вярнуўся з разведвальнага палёту. Ягоная кніга "Планета людзей" ёсць сёння ў многіх сямейных бібліятэках, а ягоная прыпавесць "Маленькі прынц" атрымала прызнанне ў дзяцей усяго свету.

У гэтыя дні ў 1944г. Чырвоная Армія поўным ходам выцясняе немцаў з Беларусі. Менавіта сёння, 29 чэрвеня, саветы занялі **Бабруйск**.

## 30 ЧЭРВЕНЯ

Сёння свет адзначае **Дзень моладзі**.

Сёння ў 1520г. завяршыўся жыццёвы шлях **Мантэсумы** – апошняга правадыра мужных і годных ацтэкаў. Пасля захопу ў палон ён заклікаў свой народ скарыцца гішпанцам, за што свае ж яго і забілі. Павучальная гісторыя пра тое, наколькі небяспечна для палітыка не вычуваць настрояў уласнага народу.

30 чэрвеня 1908г. упаў **Тунгузскі метэарыт**. Катастрофа адбылася ў Цэнтральнай Сібіры. Сведкі параўноўвалі метэарыт з вогненным бервяном у небе. Пры гэтым само неба раўло ды грукатала. Пасля падзення метэарыту зямля гайданулася ў людзей пад нагамі, а выбух чуваць было за тысячу кіламетраў ад месца здарэння. Падалі дрэвы, з вокнаў выляталі шыбы. Радыус выбуху склаў 30 кіламетраў. Гукавая хваля двойчы абышла зямны шар і была зафіксаваная ў Вашынгтоне, Лондане, Джакарце ды іншых гарадах.

А яшчэ сёння, 30 чэрвеня, ў 1911г. нарадзіўся **Чэслаў Мілаш** – паэт і празаік, наш зямляк, які ў 1980г. атрымаў літаратурную Нобелеўскую прэмію. Яшчэ ў часы савецкай Польшчы Мілаш эміграваў у ЗША. Ягоныя кнігі эсэістыкі "Родная Еўропа" і "Шуканне Айчыны" амаль цалкам перакладаліся на беларускую мову. Перакладаліся і вершы. Адзін з іх у перакладзе маладога паэта Андрэя Хадановіча – "Песня пра канец свету", якую Мілаш напісаў у 1945г.:

У дзень канца свету
Над кветкай настурцыі лётаюць пчолы,
Рыбак ладзіць свой нераток,
У моры вясёлыя скачуць дэльфіны,
А скура вужа ззяе золатам, як і павінна,
Малы верабейка чапляецца за вадасцёк.
У дзень канца свету
Жанчына па полі ідзе з парасонам,
Спіць п`яны ў абдымку з газонам,
На вуліцы крык гандляроў садавінай,
Пад ветразем лодка ідзе, як павінна,
Лунаюць скрыпічныя гукі ў паветры,
Уначы адмыкаючы зорныя нетры.
А ўсе, хто чакаў перуноў і маланак,
У расчараванні.
А ўсе, што чакалі трубы Арханёла і знакаў,
Не ў стане даць веры, што ён настае.
Пакуль над зямлёй сонца з месяцам кружаць
І чмель прылятае да ружы,
І дзеткі ружовыя родзяцца ў жонкі і мужа,
Ніхто не дасць веры, што ён настае.
І толькі сівенькі стары, які мог быць прарокам,
Але ж не прарок, бо на гэта ёсць іншыя людзі,
Падвязвае памідоры і кажа сабе:
Іншага канца свету не будзе,
Іншага канца свету не будзе.

**Гістарычны сектар**

# ЗДРАДНІКІ ЦІ ПАТРЫЁТЫ?

**59 ГАДОЎ ТАМУ СКОНЧЫЛАСЯ ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ЯНА ПРЫНЕСЛА НЕЧУВАНЫЯ ДАГЭТУЛЬ МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ СТРАТЫ, ЗАБРАЛА З САБОЙ МІЛЬЁНЫ ЧАЛАВЕЧЫХ ЖЫЦЦЯЎ. ЯШЧЭ ДОЎГА ЯЕ БУДУЦЬ ПОМНІЦЬ І Ў БЕЛАРУСІ.**




Ніхто не збіраецца аспрэчваць і апраўдваць злачынствы нацысцкага рэжыму (хоць і тут не ўсё гладка), але нельга прыпадабняць гісторыю да прымітыўнага галівудскага баевіка са стандартным сюжэтам: кепскі хлопец (bad guy) робіць нейкую прыкрасць добраму хлапцу (good gay), пасля чаго гэты "мочыць" (нявай нават і ў сарціры) гэтага, і ў выніку мы маем happy end. У жыцці такога не бывае.

Дык ці справядліва мы завем савецка-нямецкую вайну Вялікай Айчыннай? Ці сапраўды ўвесь народ адзінадушна падтрымліваў савецкіх партызанаў, а на супрацоўніцтва з немцамі ішлі толькі вылюдкі і рэнегаты?

Што тычыцца партызанаў, то ці даводзілася вам чуць успаміны аб іх старых людзей? Пагадзіцеся, – партызаны ў гэтых успамінах паўстаюць зусім не такімі, як у кнігах "пра вайну". Памятаю, мая нябожчыца бабуля, пачуўшы пра адкрыццё новага помніка партызанам, сказала прыкладна такую фразу: "Цьфу! Было б каму ставіць... Мо дзе і былі "партызаны", а па нашых лясох адно толькі бандыты бадзяліся". Хіба ў свядомасці не адной маёй бабулі партызаны трывала атаясамліваліся з бандытамі. Не будзем разглядаць тут тэзіс аб правакаванні (свядомым!) партызанамі карных аперацый супраць цывільнага насельніцтва, але будзем мець надзею, што пасля рассакрэчвання архіваў пра дзейнасць партызанаў і спецатрадаў савецкай арміі (ёсць звесткі пра знішчэнне імі цэлых вёсак з насельніцтвам пад аблічам немцаў, каб выклікаць у цывільнага насельніцтва нянавісць да акупантаў) не ў аднаго з нас мароз прадзярэ па скуры ад таго, што мы там прачытаем (вядома, калі гэтыя архівы будуць усё ж рассакрэчаныя).

Калі ж казаць пра тых, хто пайшоў на супрацоўніцтва з немцамі, то іх лічба зусім не была малой. Прыкладная колькасць беларусаў у нямецкіх збройных фарміраваннях і паліцыі – 70000 чалавек. У гэтай лічбе няма тых, хто працаваў у нямецкай адміністрацыі і розных дазволеных немцамі беларускіх арганізацыях. Гэтых людзей савецкая гістарыяграфія таксама з толькі Богу вядомых прычын залічыла да "калабарантаў".

Ідучы ў нямецкую адміністрацыю ці паліцыю, людзі кіраваліся рознымі меркаваннямі: часцей за ўсё гэта была служба за кавалак хлеба, але часта рабілі гэта з уласнага пераканання. У свядомасці большай часткі беларусаў Савецкі Саюз не быў Радзімай, а лозунг "За нашу Советскую Родину!" быў проста наборам слоў без сэнсу.

Тады чаму ж яны замест адміністрацыйнай службы не пайшлі ў лес, як гэта зрабілі ўкраінскія нацыяналісты, утварыўшы Украінскую Паўстанцкую Армію, ветэраны якой ўшаноўваюцца як нацыянальныя героі? Адказ, відаць, трэба шукаць у тым, што беларускі народ не быў (і не ёсць) настолькі нацыянальна-эмансіпаваным, як украінскі, не кажучы ўжо пра эстонцаў, латышоў і літоўцаў, якія страцілі свае нацыянальныя дзяржавы ўсяго за год да вайны. Неспрыяльным чыннікам была і рэлігійная раз'яднанасць беларускага народа, бо рэлігія часта вызначала палітычную арыентацыю.

Нацыянальную "няспеласць" беларусаў адзначалі і самі немцы, людзі бесстаронныя, кажучы пра "адсутнасць у беларусаў нацыянальнага пачуцця" і пра "самы бяскрыўдны і дзеля гэтага самы бяспечны народ з усіх народаў усходніх абшараў". Раз'яднаны і невялікі па колькасці, беларускі нацыянальны актыў у часе вайны стаяў перад выбарам: абапірацца на свае сілы і змагацца на тры франты (супраць арміі Краёвай, савецкіх партызан і немцаў) ці ісці на нейкі кампраміс з немцамі, спрабуючы пры гэтым абуджаць у беларусаў пачуццё нацыянальнай еднасці. Тым больш, што немцы самі рабілі крокі насустрач, рознымі сродкамі імкнуліся знайсці пэўнае апірышча ў беларускім народзе.

Асаблівы поспех, тут меў гаўляйтэр Беларусі Вільгельм Кубэ. Дарэчы, у сучаснай нямецкай гістарыяграфіі Кубэ лічыцца адным з нешматлікіх людзей, якія эфектыўна процідзейнічалі гімлераўскай машыне смерці.

Але, нават супрацоўнічаючы з немцамі, беларускія дзеячы спадзяваліся выйсці з-пад іхняй "апекі" і, можа, не без помачы Англіі і ЗША, распачаць змаганне за інтарэсы свайго народа. Менавіта для гэтай мэты, напрыклад, была ўтворана падпольная Партыя нацыяналістаў Беларусі (сярод сябраў – Ян Станкевіч і Вацлаў Іваноўскі).

Досвед гэтай вайны паказаў, што толькі народ, які мае моцнае нацыянальнае пачуццё, можа ператрываць жыццёвыя буры і не разбіцца на часткі. Дзеці нашага народу ваявалі міжсобку ў шэрагах Арміі Краёвай, Беларускай Краёвай Абароны, Савецкай Арміі і войсках генерала Андэрсана. Гэта стала вялікай трагедыяй беларусаў, але і навукай нам на будучыню.

Каб такое ніколі не паўтаралася, нашаму народу жыццёва неабходна тое, што ў перыяд савецкай акупацыі называлі калабарацыянізмам, нацдэмаўшчынай і г.д. Адным словам, беларусам патрэбны народны нацыяналізм, які здолее ператварыць наш народ з той бесхарактарнай масы, якую мы маем сёння, у Народ у поўным сэнсе гэтага слова.

**П.Р.Аўдашукальнік**

СМАЧНА ЕСЦІ!

# СТРАВЫ З АГАРОДНІНЫ І ГРЫБОЎ

**ЧАСТКА 1.**

### САЛАТА З БУЛЬБЫ І САЛ¨НЫХ АГУРКОЎ

*500 г бульбы, 300 г салёных агуркоў, 2 цыбуліны, 0,5 шклянкі алею, 1 яйка, соль, перац, зелень.*

Бульбу абабраць, зварыць у падсоленай вадзе, абсушыць, змяшаць з нашаткаванай цыбуляй, уліць алей і патаўчы да ўтварэння аднароднай масы. Дадаць парэзаныя дробнымі кубікамі салёныя агуркі, молаты чорны перац, перамяшаць.

Атрыманую масу абсыпаць дробна пасечаным крутым яйкам, змельчанай зеленню пятрушкі і кропу.

### САЛАТА З БУЛЬБЫ І ЗЯЛ¨НАЙ ЦЫБУЛІ

*500 г бульбы, 4 яйкі, 1 шклянка парэзанай зялёнай цыбулі, 3 ст. лыжкі алею, 1 ст. лыжка воцату, соль, перац.*

Бульбу памыць, зварыць, абліць халоднай вадой, абабраць, нарэзаць кубікамі. Дадаць звараныя ўкрутую і пасечаныя яйкі, дробна парэзаную зялёную цыбулю, перамяшаць. Заправіць алеем, воцатам, соллю і перцам.

Гэтая салата асабліва смачная, калі бульба яшчэ не астыла.

### БУРАКІ З ЧАСНАКОМ

*5-6 буракоў, 2 галоўкі часнаку, 3-4 ст. лыжкі воцату, 3 ст. лыжкі алею, соль, перац.*

Буракі зварыць, ахаладзіць, абабраць, нарэзаць скрылькамі, перасыпаць дробна пасечаным часнаком, соллю, чорным молатым перцам, апырскаць воцатам, дадаць алей, і паставіць на суткі ў халоднае месца для марынавання.

Падаць як салату або ў якасці гарніру.

### САЛАТА З КІСЛАЙ КАПУСТЫ З БУРАКАМІ

*250 г кіслай капусты, 150 г буракоў, 0,5 цыбуліны, 1 ст. лыжка алею.*

Кіслую капусту перабраць, вялікія кавалкі змяльчыць (калі вельмі кіслая, прамыць). Дадаць нарэзаныя саломкай вараныя буракі і нашаткаваную цыбулю. Заправіць алеем.

### САЛАТА «ХВІЛІНКА»

*2 буракі, 1 цыбуліна, 2 салёныя агуркі, 0,5 шклянкі маянэзу.*

Буракі зварыць, абабраць, нарэзаць саломкай. Гэтак жа нарэзаць агуркі, а цыбулю – паўкольцамі. Усё перамяшаць, заправіць маянэзам.

### САЛАТА З БУРАКОЎ І РЭДЗЬКІ

*2 буракі, 1 рэдзька, 1 цыбуліна, 4 ст. лыжкі алею, 2 ч. лыжкі воцату, соль, перац.*

Буракі зварыць, абабраць, нарэзаць саломкай. Ачышчаную рэдзьку змяльчыць на буйной тарцы, цыбулю нашаткаваць. Усё перамяшаць, дадаць соль, заліць запраўкай з алею, воцату і перцу.

**Беларуская Палічка (http://knihi.com)**

(Працяг – у наступных нумарах «Дзедзіча»)

# ЧЕМ "ВЗЯТЬ" ИНТУРИСТА?

**ПРИБЛИЖАЕТСЯ ЛЕТО — САМАЯ ГОРЯЧАЯ ПОРА ДЛЯ ТУРИСТИЧЕСКОГО БИЗНЕСА. НО СОСТОЯТЕЛЬНОГО ИНОСТРАННОГО ПУТЕШЕСТВЕННИКА БЕЛАРУСЬ ПРИТЯГИВАЕТ ГОРАЗДО МЕНЬШЕ, ЧЕМ УКРАИНА, РОССИЯ, СТРАНЫ БАЛТИИ, ПОЛЬША.**

Каким же нужно быть оптимистом, чтобы поверить в светлое будущее такого пока безнадежного дела, как отечественный туризм! Но Чеслав ШУЛЬГА — начальник управления Минспорта и туризма и директор Национального агентства по туризму верит в звезду белорусского гостеприимства:

— Туризм обязательно станет конкурентоспособным на мировом рынке. И это произойдет очень скоро, рынок изобилует свободными деньгами: у кого они есть и кто умеет из них делать новые, знают, что все меньше остается мест, куда на льготных условиях можно вложить капитал. Одним из таких мест вскоре станет туризм.

И если, к примеру, тракторы продавать будет все сложнее по той причине, что их производят десятки фирм мира, то белорусская туристическая услуга, в основе которой местные обычаи, традиции, — продукт эксклюзивный. А 3-5-звездочные отели везде одинаковые.

**— Пусть они и одинаковые, но ведь их у нас нет.**

— Как бы мы ни хвалили инвестиционную политику Беларуси, наш микроклимат проигрывает соседскому. Сегодня иностранцы возводят у себя гостиницы по наукоемким технологиям, отвечающие стандартам 2010г. А что можем предложить мы, когда вот уже много лет никак не достроим в центре Минска гостиницу "Свислочь"?!..


Фота: ByMedia.net

Маёнтак Дудуткі – першы ўдалы бізнэс-праект у сферы агратурызму на Беларусі

**— Чем же нам "взять" интуриста в исторически короткие сроки, пока не появятся пятизвездочные отели?**

— Урбанизация переселила Европу в города, а леса, луга и поля стали частной собственностью. Мы можем т.н. асфальтовому туризму противопоставить природный туризм. Он интересен и для белорусских горожан: к примеру, у 40% минчан нет родственников в деревне и дач. Сельский туризм в Беларуси сегодня более перспективен, чем классический, с его дорогими отелями и аттракционами. То, что сотворила природа, — прекрасно, а то, что сделано человеком, получилось менее удачно. А еще Беларусь может воплотить в реальность мечты и 5 млн. европейцев, занимающихся водным туризмом: реки, озера республики прекрасно подойдут для организации водных переходов.

**— Неужели вы верите в могущество агротуризма — большинство наших деревень в таком запустении?!**

— Моя вера основана на реалиях. Литовское государство после развала колхозов решило использовать проверенный Евросоюзом механизм стимулирования туризма: дало ряд льготных кредитов частным лицам — на развитие собственных усадеб, добротный вид которых и минимальный сервис привлек бы любителей деревенской тишины и сеновалов.

Только крестьяне Литвы за 2 последних года приняли 67 тыс. туристов (а наша республика в целом — 64 тыс. за 2003 г.). Притом 80% приезжего люда просили литовцев разместить их в наименее цивилизованных усадьбах "1 аист" (комфортабельность деревенских "апартаментов" — до "4 аистов").

В Чехии — свой подход к развитию агротуризма. Людям даются беспроцентные кредиты, а их стоимость банкам возвращается из местного бюджета. Народ занят делом, двумя руками голосует за власть, сохраняются традиции, развиваются народные промыслы, торговля. Почему бы и нам не пойти по пути соседей?

Для поддержания имиджа страны и гостиницам не мешало бы меньше заботиться о морали гостей с разными фамилиями, пытающихся заселиться в один номер, убрать разницу в оплате за проживание иностранцев и граждан Беларуси.

К сожалению, не только имидж, но и визовый режим у них проще. Туристы предпочитают ехать туда, где нет многочасового ожидания на переходах, виза выдается прямо на границе, где приличный придорожный сервис.

**— Почему же у нас не спешит развиваться придорожное строительство гостиниц и ресторанов, хотя государство всячески зазывает инвесторов?**

— Мало призывов, нужны конкретные действия. Ведь деньги идут туда, где выгодно. Заметьте, никто не заставляет заниматься выездным туризмом, не дает льгот. И все же почти все турфирмы занимаются вывозом белорусов за рубеж — это прибыльный бизнес.

Вместе с тем въездной туризм мало-помалу начинает набирать обороты. К примеру, на Гродненщине один предприимчивый гражданин стал делать деньги на аренде небольшого озерца. Купил причал, открыл кооператив "Червяк", кафе, наладил охрану машин: музыка играет, рыба жарится — народ отдыхает.

Однако таких точек крайне мало. Как показал проведенный Национальным агентством по туризму опрос, интурист оставляет в Беларуси 70-200 USD, в Литве — в 2 раза больше, в Польше — в 4. Мы не можем "забрать" деньги иностранца. Даже белорусы на выходные ездят в Миколайки либо в Вильнюс, а не на Нарочь либо в Мирский замок. А чего ехать? Рядом с замком лишь сувенирная лавка — ни лодки, ни лошадей прокатиться, ни в гостинице отдохнуть.

Не случайно Евросоюз предлагает новым членам организовать сильную туристическую структуру. Он не выделяет деньги на рестораны, гостиницы, а на создание имиджа туристического региона. В 2004г. Литва на это потратит 3 млн. USD, не отстают Украина — 5 млн. USD, Москва — 10 млн. Хотя, казалось бы, зачем Москве нужно тратить такие деньги, когда этот город и все его достопримечательности и так все знают?..

**— Может, и нам нужно более активно информировать о тех точках на карте Беларуси, которые стали привлекательными для туриста, — и заезжего, и своего...**

— Национальное агентство по туризму намерено открыть туристско-информационный центр, где бы гости и жители страны могли узнать об исторических и культурных достопримечательностях региона, торговых точках по продаже сувениров, заказать гида-переводчика, тур по республике.

**Беседовала Т. МАРКИНА**

**Рэдакцыя бюлетэня**
**“ДЗЕДЗІЧ”**
**шукае**
**распаўсюджвальнікаў**
**выдання**
**ў навучальных установах**
**Берасця і вобласці.**
**Тэл.: (0162) 23-68-02.**

**Рэдакцыя бюлетэня**
**«ДЗЕДЗІЧ»**
**запрашае да супрацоўніцтва**
**маладых людзей**
**ад 16 да 30 гадоў**
**з Берасця і гарадоў вобласці.**
**Калі вы жадаеце**
**выказаць свае думкі**
**на нашых старонках,**
**тэлефануйце: (0162) 23-68-02.**

АБ'ЯВЫ

# БІБЛІЯТЭКА ДЛЯ МОЛАДЗЕВЫХ НДА

У памяшканні БАМГА "Сузор'е" адкрылася бібліятэка НДА для прадстаўнікоў моладзевых арганізацый Берасцейшчыны і проста ініцыятыўных людзей. Яна змяшчае кнігі і дапаможнікі па арганізацыі дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Карысную літаратуру па рэгістрацыі НДА, арганізацыі справаводства, пошуку фінансавання, працы з валанцёрамі, Public Relations у НДА і шмат-шмат іншай цікавай інфармацыі можна знайсці, звярнуўшыся ў БАМГА "Сузор'е".

Бібліятэка ўтрымлівае таксама літаратуру па наступных раздзелах:

– Выбары (арганізацыя выбарчых кампаніяў, агітацыя, назіранне);

– СМІ (рэгістрацыя і дзейнасць газет, рэкламная дзейнасць, нарматыўна-прававыя акты);

– Правы чалавека (метадычныя дапаможнікі, маніторынг парушэнняў правоў чалавека на Беларусі, міжнародныя акты і інш.);

– Гісторыя Беларусі (навуковыя матэрыялы, падручнікі, папулярная літаратура);

– Мовазнаўства (слоўнікі, дапаможнікі для тых, хто вывучае беларускую мову);

– Бюлетэні, брашуры і часопісы НДА Берасцейшчыны і краіны;

– Замежная літаратура (слоўнікі, кнігі, часопісы, газеты на ангельскай, польскай, украінскай, літоўскай і латвійскай мовах; матэрыялы па краязнаўству суседніх (і не вельмі) краін на беларускай мове);

– Мастацкая літаратура (на беларускай і расейскай мовах).

Бібліятэка чакае наведвальнікаў штодня з $12^{00}$ да $16^{00}$ (акрамя суботы і нядзелі). Заходзьце, не пашкадуеце. Калі патрэбнай вам літаратуры няма (і такое можа здарыцца), супрацоўнікі бібліятэкі дапамогуць у яе пошуку.

**Dzedzich week-news**

# ИНТЕРЕСНО, ЧТО ТЫ ДЕЛАЕШЬ С 11 ПО 21 ИЮЛЯ 2004 ГОДА?

У НАС ЕСТЬ КЛАССНОЕ ПРЕДЛОЖЕНИЕ ДЛЯ ТЕБЯ!

Ты жаждешь интересной жизни.
Тебе от 18 до 27 лет.
Ты ищешь ярких приключений и новых друзей.
Хочешь сделать мир лучше.
До безумия любишь лес, костер, гитару, озеро, новые знания, свободу и просто любишь!

**В таком случае:**

Мы сообщаем, что с 11 по 21 июля 2004г. Белорусское Молодежное Общественное Объединение "Разные-Равные" проводит **Летний Интеграционный Палаточный Лагерь "Круглое Озеро-2004".**

Место будущей стоянки – Плещеницкое водохранилище.

Участники палаточного лагеря – молодежь от 18 до 27 лет, люди с ограниченными физическим возможностями и без таковых. Программа лагеря подготовлена с учетом принципа 50/50=100% успеха. Данная "золотая формула", по которой работает организация, предусматривает равное участие в мероприятиях палаточного лагеря как молодых людей с ограниченными физическими возможностями, так и молодежи без физических ограничений. Только вместе можно добиться успеха, избавиться от негативных стереотипов, предрассудков и комплексов и создать гармоничный мир, в котором все равны.

Это шестой лагерь, который будет проводить организация. Предыдущие лагеря проходили в различных местах нашей Родины: озеро Швакшты (1999г.), Белое озеро (2000г.), Плещеницкое водохранилище (2001г., 2003г.), Вилейское водохранилище (2002г.).

Каждый год мы делаем обучающую программу "Круглого Озера" увлекательной и разнообразной: экология, основы работы в НГО, конфликтология, стереотипы и предрассудки, и многое другое.

У участников летнего лагеря будет возможность здорово потусоваться, слиться с природой и применить полученные знания на практике.

**КРУГЛОЕ ОЗЕРО – каждый день новые впечатления!**

**В программе:**

НГОшный ликбез – правда о третьем секторе!
Работа в команде – миф или реальность?
Интеграция – кому это нужно?
Инвалид = Человек!
Обучающие интерактивные игры!
Песни под гитары, барабаны и под другие подручные средства.
Регулярное кормление комаров (мы же любим природу?).
Борьба со стихией и нежеланием вернуться домой… :).

**Для участия в Летнем Интеграционном Палаточном Лагере "Круглое Озеро-2004" Вам необходимо заполнить анкету-заявку.**

**Анкету можно получить по адресу:**
220012, Республика Беларусь, г. Минск,
пер. Калинина 16-7-348.

**Телефон для справок:** +375 (017) 287-38-17.
Контактные лица: Галина Крот, Вадим Колошкин.

# КУПЛЯЙ БЕЛАРУСКАЕ

Часопісы («Arche», «Дзеяслоў» і інш.), беларускія кнігі, якія не прадаюць у крамах, а таксама беларускамоўнае відэа ("Гладыятар", "Адважнае сэрца", "Матрыца", інш.) і музыка беларускіх выканаўцаў па нізкіх коштах (без гандлёвай надбаўкі). Гэта ўсё цяпер можна набыць у Берасці.

Тэл.: (029) 727-44-83 (Андрусь).

**Dzedzich week-news**

**Фонд «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

## WEB-дызайнера

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**

**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**

**Тэл.: 23-68-02, (029) 660-57-41.**

## Беларуская палічка запрашае

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

**Шаноўны чытач!**

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Кірава, д. 67, кв. 3.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:

**Увага!**

**Працягваецца бясплатная падпіска**

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымліваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, вул. Кірава, д. 67, кв. 3.**

Чаму ты вырашыў падпісацца:

Прозвішча:

Імя:

Імя па бацьку:

Паштовы адрас:

Тэлефон:

## ДАРЭЧЫ

Прыходзяць неяк у госці да Кроліка Віні-Пух і Пятачок. Як водзіцца, пад'елі, Пух з'еў усё, што ў доме было салодкага. Сабраліся сыходзіць, і тут Віні-Пуха заклініла у праходзе: ні туды, ні сюды. Кролік (ён жа разумны) кінуў ідэю:

- Пятачок, ты цягні яго звонку за лапы, а я буду ззаду штурхаць.

Пятачок пагадзіўся. Цягне ён, цягне, Віні толькі ўздыхае ды крахціць. Раптам, вочы ў яго пачынаюць павялічвацца да немагчымага, і ён шапоча Пятачку:

- Пятачок! Цягні хутчэй з хаты ружжо! Мне здаецца, што гэта нейкі няправільны кролік!

***

У ваенкамаце:

- Вы служыць хочаце?
- Так, але толькі генералам!
- Вы што, ідыёт?
- А гэта абавязковая умова?

***

Прыходзіць мужык дахаты, а ў ваннай – страус.

Потым прыглядзеўся: усё нармальна – жонка бялізну мые!

***

Студэнтка універсітэта Розі Рэйд, якая выставіла на інтэрнэт-аўкцыён сваю цнатлівасць, каб аплаціць вучобу, нарэшце пераспала з чалавекам, які прапанаваў ёй найвышэйшы кошт. Ім аказаўся разведзены мужчына, 44 гады, бацька дваіх дзяцей. ¨н заплаціў студэнтцы $20500. Гэтая сума дазволіць Розі працягнуць навучанне ва універсітэце Брыстоля пасля таго, як яна адсядзіць у турме 7 гадоў за прастытуцыю.

***

Будзь сціплым, і табе даруюць, што ты існуеш.

***

- Уяўляеш, вяртаюся ноччу дахаты, а жонка ў ложку з нейкім мужыком ляжыць...

- Во, блін! З нейкім мужыком! Давай цяпер ужо сяброў у твар пазнаваць не будзем!

***

У мінулым годзе на курортах Крыма колькасць адпачывальнікаў жаночага полу перавышала мужчынскую настолькі, што многія дзяўчыны вярта-ліся дамоў не адпачнуўшы.

***

- Калі ў мяне будуць унукі? - злосна спытаў бацька ў сына.

- Даруй, баця, усё неяк рукі не даходзяць...

***

Спецыяльна для памежнікаў вучоныя скрыжавалі вартавога сабаку і труса...

Цяпер звярушка не толькі даганяе парушальніка мяжы, але і карае!

***

Габрэі - самы аптымістычны народ у свеце: яшчэ не ведаюць, да якога памера ў іх вырасце, а ўжо абразаюць.

***

Хай лепш над табой смяюцца, чым плачуць.

***

Здзеклівы жарт дэпутата: "Вы не правыя і не левыя, вы – як валенкі!"

Заўважана, што надпіс на капоце машыны "ДАІшнікі – казлы" значна хутчэй прыводзіць да мойкі, чым варыяцыі на тэму: "Памый мяне, я ўся чашуся".

***

- Што лепш падараваць: адзін вялікі падарунак ці шмат маленькіх?
- Шмат маленькіх!
- Тады падарую ёй семячкі!

***

У вясковы ЗАГС прыходзіць жанчына рэгістраваць дзіця. Рэгістратарша пытае:

- Хто бацька?
- Ды Васька з Чарноўкі.
- Вось цікава! На гэтым тыдні - Зінка з Сасноўкі, Манька з Валабуеўкі, Валька з Міцяева, Кацярына Матвееўна з цэнтральнай сядзібы, цяпер вось вы з Сямёнаўкі... І ва ўсіх бацька - Васька з Чарноўкі! І як гэта ў яго атрымліваецца?..
- Вядома як! У яго ж лісапет!

***

- Тук-тук!!!
- Хто там?!
- Капец.
- Чаго трэба?!
- Ды вось, прыйшоў...

***

Класны кіраўнік:

- Тэма нашага сённяшняга бацькоўскага сходу: «Жабрацкая зарплата работнікаў адукацыі»...

***

Шыем па замове! Любыя справы па Вашым жаданні!!!

Звяртацца ў камерцыйны аддзел гарадской пракуратуры.

***

У беларускім турбюро:

– Дайце мне танную пуцёўку ў дом адпачынку! Даляраў за 50. Але, каб там былі бібліятэка, більярд, басейн, трэнажорная заля, сауна, прыстойнае харчаванне, а ў нумары – тэлевізар, камп'ютар, відэа!

– Ну, у нас за такія грошы такіх пуцёвак няма!

– А хочаце ўсё гэта атрымаць бясплатна?

– Якім чынам?

– Звярніцеся ў шведскую турму!

***

Сядзяць дзве дзяўчынкі на даху, адна злая, другая добрая, і плююць на галовы мінакоў. Злая патрапіла тры разы, а добрая - пяць. Вось так дабро перамагло зло.

***

- Як у вас сёння справы, спадарыня?
- Зараз па каляндарыку пагляджу...

***

Марозка запытвае:

- Ці цёпла табе дзяўчына, ці цёпла табе, прыгажуня?
- Ды проста афігець, дзядуля! Не сугроб, блін, а салярый...

***

Крывавая нядзеля яшчэ раз паказала, што цар мог страляць не толькі па працоўных, але і па выхадных...

Ісус, распяты на крыжы, ад адзіноты пачынае вітацца з усімі жывёлінамі:

- Прывітанне, сабака!
- Гаў!

Праз нейкі час:

- Вітаю, кот!
- Мяў!

Яшчэ праз нейкі час:

- Вітаю, бабёр! Бабёр??? (Радасна) Бабёр!!!

***

Якасць зубной пасты "Аквафрэш" пастаянна паляпшаецца. Таму не варта набываць пасту "Аквафрэш" сёння - заўтра вы зможаце набыць значна лепшую. "Аквафрэш": пасьпяшыш – людзей насмяшыш!

***

Да ўвагі кліентаў!

Міністэрства абароны прапануе вам паслугі вясельнага генерала!!!

За сімвалічную плату ў 2-3 тысячы даляраў любы з супрацоўнікаў міністэрства і нават сам міністр абароны (за 5 тысяч) папрысутнічаюць у вас на вяселлі, хаўтурах і да т.п.

Магчымы і іншыя паслугі!!!

Паслугі вясельнага лейтэнанта, нядорага. Можна нават толькі за ежу.

***

"Тэрмінатар-3" - самы дарагі ў гісторыі перадвыбарчы ролік.

"Аншлаг" - самы працяглы.

***

Літва, вечар. На ганак хутарскога дома выходзіць гаспадыня.

- Шарык!

Цішыня.

- Шарык!

Цішыня.

- Шарыкас!
- Гаўс! Гаўс!

***

Калі вы хочаце ведаць, што Бог думае пра грошы, пагядзіце, каму ён іх дае. М.Берынг.

***

Кампанія Майкрасофт набыла Макдональдс. Цяпер пры набыцці гамбургера трэба пацвердзіць подпісам, што вы яго з'ясце самі, а на працягу 5 гадоў пасля пакупкі вам будуць бясплатна выдаваць недададзеныя інгрыдыенты.

***

Пытанне:

Як САПРАЎДНЫ мужчына даведваецца, што ў жанчыны наступіў аргазм?

Адказ:

- Сапраўднаму мужыку гэта пофіг...

***

Падчас чарговай перазагрузкі марсахода Спірыт расейскія хакеры запусцілі ў яго вірус. Цяпер марсаход рые сабе магілу ў марсіянскім грунце.

***

Вельмі цяжка ўсё жыццё поўзаць з высока ўзнятай галавой.

***

Улічваючы мясцовую спецыфіку, НАТА накіравала на ахову певетранай прасторы Эстоніі дырыжабль.

№4 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
чэрвень 2004

**ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ**

**Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі**

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк: 14.06.2004 у $18^{00}$**
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Лена, М. Ікола, Д. Змітрый, М. Арыя, С. Яргей, С. Яржук, Ю. Рась.
**Адказны сакратар:** А. Ндрусь. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 23-68-02, (029) 660-57-41
**E-mail:** dzedzich@mail.ru